ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 258 (1225) ‖ ПЯТНІЦА, 7-га лістапада 1930 г.

Няхай жыве XIII гадавіна вялікага Кастрычніка

ПАД ЛЕНІНСКІМ СЬЦЯГАМ МЫ ПЕРАМОЖАМ

Да ўсіх рабочых, работніц, комгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства, чырвонаармейцаў і ўсіх працоўных БССР

(З адозвы ЦК КП(б)Б)

25 кастрычніка (7-XI) 1917 году пролетарыят Расіі на чале з партыяй бальшавікоў, пры непасрэдным удзеле кіраўніцтве У. І. Леніна, у крывавых баёх з царызмам, з абшарнікамі буржуазіяй заваяваў дыктатуру пролетарыяту, утварыўшы першую ў сьвеце рэспубліку рабочае клясы.

Таварышы! Посьпехі і бурны рост СССР—базы сусьветнай пролетарскай рэволюцыі — выклікаюць зьвярыную ненавісьць імпэрыялістычных драпежнікаў да рабочае дзяржавы. Буржуазія, разам з социял-фашыстымі, ні на хвіліну ня спыняе цкаваньне СССР і вядзе разьюшаную расправу з рэволюцыйнымі рабочымі. Сусьветны капіталізм знаходзіцца ў ціскох эканамічнаг крызісу, які вядзе капіталістычны сьвет да пагібелі, набліжае пролетарскую рэволюцыю, уцягвае ўсё новыя і новыя мільёны працоўных капіталістычных дзяржаў, калёній і паўкалёній у шэрагі змагароў за сусьветны Кастрычнік. Крызіс абвастрае супяр чнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі і набліжае новую імпэрыялістычную вайну, прысьпешваючы падрыхтоўку контррэволюцыйнага ўзброенага нападу на СССР. Шалёная антысавецкая кампанія супроць Савецкага Саюзу і савецкага замежнага гандлю зьяўляецца далейшым крокам па шляху інтэрвэнцыі супроць СССР—бацькаўшчыны пролетарыяту ўсяго сьвету.

Таварышы! Толькі дзякуючы Кастрычнікавай рэволюцыі Савецкая Беларусь, у саюзе і пры дапамозе працоўных СССР, увашла ў братэрскую сям'ю рэспублік саветаў і з нішчае ўскраіны прыгнечанай някультурнай краіны. На прыкладзе грандыёзнага соцыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, дзе нанава будуюцца гіганты—заводы, узьнікаюць магутныя электрастанцыі, ствараюцца буйныя колектыўныя гаспада кі—працоўныя БССР упэўніваюцца ў адзіна правільнай нацыянальнай і гаспадарчай політыцы, праводзімай КП(б)Б. Асобныя спробы ўнутранай контррэволюцыі, шкоднікаў, беларускіх нацдэмакратаў, якія зьяўляюцца простымі памочнікамі фашыстых, затрымаць магутны рост соцыялізму разьбіваюцца і будуць разьбівацца цьвёрдай пролетарскай рукою.

Таварышы! У дні гадавіны Кастрычніка працоўныя СССР падводзяць вынікі сваім перамогам на соцыялістычным фронце, за якія з захапленьнем глядзіць рэволюцыйны пролетарыят Захаду і дрыжаць ад шалёнай ненавісьці капіталістычнага сьвету. Матэрыяльнае становішча рабочае клясы і працоўных СССР значна палепшылася, беспрацоўе ўжо зьнішчана ў той час, як у краінах капіталізму яно няспынна расьце. Соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі шпаркімі крокамі наперад Савецкага Саюза ўвайшоў у паласу практычна ажыцьцяўлен ня соцыялізму. Гэтых дасягненьні краіна саветаў змагла атрымаць толькі дзякуючы правільнай політыцы комуністычнае партыі, якая вяла і вядзе бязьлітасную барацьбу з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, мобілізуючы масы супроць правага ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, супроць „левых" загібаў, супроць двурушніцтва і прымірэнства да ўхілаў.

Далейшае пасьпяховае разгортваньне будаўніцтва соцыялізму можа праходзіць толькі пры ўзмацненьні бязьлітаснай барацьбы з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, якія зьяўляюцца рупарам контррэволюцыйных элемэнтаў. Далейшае прасоўваньне наперад па шляху пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва патрабуе яшчэ большых тэмпаў, большай напружанасьці, большай актыўнасьці працоўных мас. Перад партыяй, перад рабочаю клясай, перад усімі працоўнымі напярэдадні 14-га году дыктатуры пролетарыяту стаяць задачы:

Яшчэ з большым энтузіязмам біцца за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, за ліквідацыю прарываў у прамысловасьці. Забясьпечыць ударнае выкананьне асобага кварталу і трэцяга году пяцігодкі. Організаваць „брыгады Кастрычніка" на штурм прарываў і ўзяцьце соцыялістычных вышынь разьвіцьця прамысловасьці. Мобілізаваць унутраныя рэсурсы прадпрыемстваў і скарыстаць цалкам і поўнасьцю рабочую ініцыятыву, вынаходніцтва. Разгарнуць рабочую грамадзкасьць і ўцягнуць у творчую працу сотні тысяч новых рабочых. Выкрываць шкоднікаў і лжэ-ўдарнікаў гультаёў, бюрократаў і ўсіх іншых, што зрываюць і перашкаджаюць нашай пераможнай працы. Не здаваць заваяваныя позыцыі, а яшчэ шпарчэй, мэтодамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, змагацца за бальшавіцкія тэмпы соцыялістычнай будоўлі.

На падставе правільнай ленінскай лініі, мэтодамі поўнай добраахвотнасьці, забясьпечыць далейшае шырокае разгортваньне колгаснага руху. Колгасьнікі павінны дапамагчы бядняцка-серадняцкаму аднаасобніку колектывізавацца, організуючы прыём новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя колгасы і дапамагаючы стварэньню ініцыятыўных колгасных груп. Весьці неаслабную працу па ўнутраным гаспадарчым умацаваньні існуючых колгасаў. Выканаць і перавыканаць нарыхтоўкі па ўсіх відах, мобілізаваць сродкі на пасьпяховае выкананьне нашых пляпаў. Весьці рашучую барацьбу з кулацтвам, ліквідуючы яго як клясу на падставе суцэльнай колектывізацыі. Ажыцьцяўляючы партыйнае і пролетарскае кіраўніцтва, разгарнуць ініцыятыву бядняцка-серадняцкіх мас вёскі за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, за новую колектывізаваную вёску.

Задача захаваньня міру патрабуе ад працоўных СССР непаслабнай увагі да абараназдольнасьці пролетарскай дзяржавы, узмацненьня цеснай братэрскай сувязі з пролетарыятам і працоўнымі капіталістычных краін. Сусьветны імпэрыялізм рыхтуецца ўзброенай сілай перашкодзіць нашаму будаўніцтву. Мы павінны быць на варце. Прымежнасьць БССР патрабуе ад працоўных яшчэ больш узмацняць абарону рэспублікі саветаў. Будзем трымаць цесную сувязь з нашай слаўнай Чырвонай арміяй і падрыхтаваць з мільёнаў працоўных умелых байцоў за заваёвы Кастрычніка.

Пасьпяховае нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР ня можаісьці без пасьпяховага праводзеньня ленінскай нацполітыкі і рашучай барацьбы з вялікарасійскім шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, адначасова ўзмацняючы барацьбу з контррэволюцыйным нацдэмократызмам і інш. шовінізмамі. Узмацніць пролетарскае кіраўніцтва будаўніцтвам культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу—першачарговая задача рабочае клясы і ўсёй КП(б)Б. Працоўныя БССР! У XIII гадавіну Кастрычнікавай рэволюцыі яшчэ шчыльней згуртуйцеся вакол ленінскай комуністычнай партыі—кіраўніка і організатара Кастрычнікавых перамог.

Няхай жыве пролетарская рэволюцыя!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Няхай жыве партыя Леніна!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі.



ЧАРГОВЫ НУМАР ГАЗЭТЫ „ЧЫРВ. ЗЬМЕНА" ВЫЙДЗЕ 10-га ЛІСТАПАДА

ПАЖАР РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ БОЕК УЗЬНІМАЕЦЦА НАД УСІМ СЬВЕТАМ

ЗАТХЛАСЬЦЬ ТУРАМ
І СКРЫП ПЯТЛІ,
ЗАЛПЫ РАСТРЭЛАЎ,
СЬПЯВАНЬНЕ АБЕДНЯЎ

СЛУХАЙ, ЭЎРОПА ТЫ, КОРЧ АБАДРАНЫ-
Б'Е НОВЫ, Б'Е НОВЫ СТРУМЕНЬ!

НЯ Ў СІЛАХ СТРЫМАЦЬ
КОМСАМОЛЬСКІ ПАРЫЎ-
РАБОЧУЮ ВОЛЮ
ДА БАРАЦЬБЫ.

11 комсамольцаў перад дзяржаўным судом

Так гэта афіцыйна значылася. Члены нямецкага комуністычнага саюзу моладзі: чорнарабочы **Франц Гаўбэнрайсэр**, рабочы **Фрыц Матой**, рабочы будаўнік **Отто Герман**, рабочы **Альфрэд Барс**, рабочы **Фрыц Фратор'юс**, рабочы **Вэльцэр Гэрцыг**, рабочы **Вілі Дрэвэнштэт** чорнарабочы **Вільгэльм Дэнтэр**, мэталісты **Генрык Эсэр**, сьлёсар **Якуб Гэльмштэтэр** і будаўнік **Эрыст Шэйнэ** — гэта яны падсудныя.

ФОТО



Дэманстрацыя Лейпцыгскага комсамолу ў XVI юнацкі дзень.

Фактычна на лаве падсудных сядзіць нямецкі комсамол, супроць якога ўзьнята абвінавачваньне у нячуванай судовай провокацыі. Таму нямецкія рабочыя назвалі гэты процэс: **помста - процэс супроць нямецкага комсамолу**.

Гумовымі дубцамі спаткалі комсамольцаў

Сотні тысяч маршыравалі вясною ў **Лейпцыг** на „Дзяржаўны зьлёт моладзі". Гэтыя сотні тысяч дэманстравалі за паролі, за лёзунгі нямецкага комсамолу. Уся буржуазія, а яшчэ больш социял-фашысцкі друк у гэтыя дні распаўсюджвалі сярод сваіх чытачоў такую паніку, як-бы ў гэты момант у іх магла ўзарвацца соцыялістычная рэволюцыя. Пад уплывам гэтай здрадніцкай кампаніі **Лейпцыгскі** магістрат адмовіўся даць школы для масавых інтэрнатаў (соцыял-фашысцкая прэса патрабавала, каб дэмонстрантам нават вады не давалі), пад яе ўплывам рыхтавалася **Лейпцыгская** поліцыя да сваёй працы і з гумовымі дубцамі спаткала нямецкіх комсамольцаў пры ўваходзе ў **Лейпцыг**. Калі провокацыя не памагла, поліцыя пашла на ўсё і дазволіла прыватнаму аўтомобілю (супроць сваёй-жа забароны) праехаць на пляц, дзе дэмонстравалі сотні тысяч. Маладыя рабочыя гэты аўтомобіль не прапусьцілі. Поліцыя скарыстоўвае гэты момант для провакацыі. Член соцыял-дэмократычнай партыі, поліцэй-офіцэр — „таварыш" **Гале** страляе і забівае комсамольца **Дзібэ**. А праз хвіліну ад **Гале** і яго памочніка нічога не застаецца—яны на сьмерць затаптаны тысячамі маладых рабочых, якія акружылі гэты пляц. Да позьняга вечара наводзіла „парадак" „армія вялікае здрады". А вось сёньня абвінавачваюць 11 маладых рабочых за тое, што яны

НАРЫС



Агітгрупа Цэнтральнага раёну Лейпцыгу з карыкатурамі да XVI юнацкага дню.

вызвалі непакой, што яны забілі Гале на магілу якога соцыял-фашыстыя палажылі чырвоны сьцяг (?!)

Галоўны сьведка—вар'ят.

29-га верасьня пачаўся процэс—10 кастрычніка ён скончыўся. За гэты час прашлі дзесяткі сьведак абвінавачваньня і адзін за адным павінны былі констатаваць, што фактычна яны нічога ня ведаюць, нічога ня бачылі і ня чулі. І гэта ёсьць ілюстраваньне сёньнешняй політыкі „сытуацыі на лезьве нажа" што галоўныя сьведкі былі членамі соцыял фашысцкай партыі.

Галоўны сьведка абвінавачваньня **Бэердорф так** падрабязна намаляваў перад судом плян месца, дзе адбылася сутычка, як-бы ён гаварыў гэта ў час здарэньня. Потым аказалася, што гэты сьведка два разы сядзеў у вар'яцкім доме. Адзін за адным банкрутавалі сьведкі абвінавачваньня. Але ўсё-ж мы не дачакаліся прысуду на вызваленьне.

„Браты,—да сонца, да сьвету!"

Соцыял-фашысцкі друк, упэўніўшыся ў банкруцтве сваіх сьведкаў, узьняў лямант: „Пляны грамадзянскай вайны компартыі, здрадніцтва комсамолу". Яны растлумачылі даўно вядомае для нямецкага пролетарыяту,—што процэс павінен быць накіраваны супроць моладзі, як гэткай, што падсудныя зьяўляюцца толькі выканаўцамі—на лаве падсудных павінны сядзець тэорэтыкі кіраўнікі, ініцыятары.

І таму нікога ня зьдзівіў вынесены ў чацьвер 10-га кастрычніка прысуд. **Гаўбэнкрайсар—да 6 г. катаргі, Бэрс і Фратор'юс—да 2-х год 6 мес. кожны. Матой і Эсэр—да 2-х год катаргі, Гэльмштэтэр і Шэйнэ—1 з пол. гады турмы, Гэрцыг—8 месяцаў турмы, Герман—2 годы турмы.**

БАРАЦЬБЫ



Узброены атрад паліцыі перад нападам на атрад юных піонэраў у XVI юнацкі дзень у Лейпцыгу.

„11 комсамольцаў прысуджаны да 15 год катаргі і 4-х з паловай год турмы".

А. Проко.

Лейпцыг.

„Мы далучымся да Чырвонай арміі

Ва ўсёй Польшчы і асабліва ў окупаванай Заходняй Беларусі ўздымаецца магутная рэволюцыйная хваля, нарастаюць вялікія клясавыя бойкі супроць фашысцкай дыктатуры.

Тэхніка фашысцкага муштру

Сілком загнаныя ў фашысцкія казармы, маладыя рабочыя і працоўныя сяляне трымаюцца ў самым жорсткім рэжыме. Фашысцкія генэралы і офіцэры, каб лягчэй вымуштраваць і падрыхтаваць салдат на бойню супроць СССР і для падаўленьня рэволюцыйнага руху ўнутры краіны, за найменшую непадатнасьць вайсковай і маральнай вывучцы накладаюць суровую кару, зьдзекваюцца і на доўгія гады саджаюць у турмы.

Становішча салдат фашысцкага войска вельмі цяжкое. Ва многіх палкох і аддзелах арміі бываюць выпадкі павальнага атручваньня салдат. Напрыклад, за апошні час атручана 16 салдат у 81-м палку пяхоты, да 100 лётнікаў—у Лідзі, у Падбродзьдзі (пад Вільняй) узарваны гранатамі пры навучаньні 13 уланаў.

Калі новабранец ня ўмее поўзаць ракам як сабака, ці па-гусінаму, ці па-жаб'яму, ці „штурмова падні" па 50-100 разоў, дык штодзень мучаюць яго горш за скаціну. Усё гэта бывае даводзіць салдат да роспачы і самагубства.

Ад катаваньняў і цкаваньня некаторыя салдаты выпальваюць сабе вочы, толькі-б пазбавіцца катаржнай службы ў фашысцкай арміі. За непаслухмянасьць у 6-ым і 7-ым эскадроне некалькіх уланаў саслалі на доўгі час у турму.

... Даём руку змагаром працоўным...

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, салдаты ўсё часьцей падаю[ць] свае рукі змагаром працоўным. [У] Слонімскім павеце, прысутныя [на] дэмонстрацыі бядняцка-серадняц[кіх] мас супроць фашызму, супроць [па]даткаў, вэндзы і голаду салд[аты] далучыліся да дэмонстрантаў, ра[зам] дэмонстравалі і баранілі іх ад [на]падаў поліцыі. У Лодзі і Заве[рцы] салдаты перайшлі на бок дэмо[н]струючых рабочых і адбівалі на[па]ды поліцыі і соцыял-фашыстых. [У] мястэчку Сямяцічы, каля Бел[ь]ск Падляскага салдаты таксама н[а]дзілі дэмонстрацыю за свае пра[вы,] за палепшаньне ўмоў жыцьця с[ал]дата і далі дружны адпор полі[цыі,] збудаваўшы барыкады.

Праявы барацьбы салдат нагл[я]юцца ў кожнай роце, у кож[ным] палку. Рэволюцыйныя выступле[ньні] навабранцаў, якіх прымусам [га]няюць у фашысцкія казармы [у] Аранах, Горадні, Беластоку, Ві[льні] усе гэтыя, так званыя, „бу[нты"] яскрава сьведчаць аб пранікне[ньні] рэволюцыйных настрояў і энтузі[язь]ме салдат у справе барацьбы з [фа]шызмам.

Усё часьцей праяўляюцца фа[кты,] калі з аружжам у руках яны [ста]ваюцца ў шэрагі дэмонструю[чых] клясавых братоў і разам з раб[оча]-сялянскай масавай самаабароная [не] дапускаюць разгрому дэмонстра[цый] поліцыяй і жандарамі. Нагляда[ныя] факты, калі салдаты кляну[цца] раходзіць на бок Чырвонай а[рміі] калі іх пагоняць на фронт суп[роць] СССР.

Мы супроць вайны з СССР

У сучасны момант, калі ўся [фа]шысцкая і соцыял-фашысцкая [зграя] сабак, у мэтах падрыхтоўкі ко[нтр]рэволюцыйнай вайны, стараец[ца з] усіх бакоў апляваць Савецкі [Саюз] у вачу шырокіх працоўных [мас] Заходняй Беларусі, якую фаш[ысц]кая дыктатура абабрала пляцдар[мам] падрыхтоўкі нападу на ўдуш[эньне] БССР,—комуністычны саюз мо[ладзі] Заходняй Беларусі стараецца [рас]крыць усю гэтую хлусьню фаш[ыстаў] і дэмаскаваць імпэрыялісты[чныя] пляны. Дзеля гэтага, разам з [пра]пагандай аб дасягненьнях БСС[Р на] фронце соцыялістычнага будаўні[цтва,] колектывізацыі сельскай гаспа[даркі] і ліквідацыі кулацтва як клясы [на] базе суцэльнай колектывізацыі, [ко]муністычны Саюз Моладзі Захо[дняй] Беларусі выкінуў лёзунг збору [гро]шай на трактар для шпарчэй[шай] колектывізацыі БССР.

КАРАЦЕЛІ

Нарыс Нік. Андрэева

— Паліцыя!

Дзікі крык жаху прарэзаў вясковую ціш. Зараз-жа за гэтым з гойканьнем і тупатам уварвалася конная сотня. Засьвісталі бізуны. Стогны і крыкі зьбіваных сялян прытлушаліся самай бруднай поліцэйскай лаянкай.

Гэта было ў вёсцы Купчыцах, Тарнопальскага павету (Заходняя Украіна).

На стыку трох ваяводзтваў

У пачатку ліпеня на стыку трох ваяводзтваў—Тарнопальскага, Львоўскага і Станіслаўскага—выбухнуў рэволюцыйны рух сярод украінскіх сялян. У гэтых ваяводзтвах паўмільёна бядняцкіх двароў маюць па 1 гэктару зямлі на гаспадарку, а 4 з паловай тысячы абшарнікаў уладаюць больш чым 2 млн. гэктараў, што складае ў сярэднім звыш паўтысячы гэктараў на кожнага абшарніка.

Рэволюцыйны рух хутка ператтварыўся ў стыхійнае паўстаньне, ахапіла тысячы сёл і вёсак Заходняй Украіны, якая займае каля трэцяй часткі ўсяе Польшчы. Сялянства Заходняй Украіны ня вынесла падвойнага ўціску—экономічнага і нацыянальнага.

Паны ў паніцы

Хаваліся ў паніцы перад чырвонай небясьпекаю паны-абшарнікі. Замітусіліся палякі чыноўнікі—праваднікі політыкі нацыянальнага прыгнечаньня працоўных украінцаў, і палякі-асаднікі—былыя вайскова-служачыя, якімі польскі ўрад насяляе свае крэсы, надзяляючы іх лепшымі землямі, вырашчваючы з іх кулакоў і апору панскай улады. Польскі ўрад мобілізаваў кавалерыйскія часткі, звыш 3 тысяч поліцэйскіх і ў ноч на 20-ае верасьня пасунуў гэту карную армію на Заходнюю Украіну.

Палілася кроў

Расправа была зьверскай. Карныя аддзелы спаборнічалі паміж сабою ў жорсткасьці. Налёт на вёску Купчыцы—гэта ледзь толькі кропля ў моры крывавай расправы, учыненай апрычнікамі Пілсудзкага над украінскімі вёскамі.

Лупцуючы, каты прыгаварвалі:

— Сялянам занадта добра жывецца, таму яны і займаюцца політыкай.

Аднаго з сялян—Снавідовіч—карацелі прывязалі з распасьцёртымі рукамі да рамы акна і ў такім становішчы зьбівалі да таго часу, пакуль Снадовіч ня страціў прытомнасьць.

Сяляне бягуць у лясы, хаваюцца ад карацеляў. Але ня толькі хаваюцца—сяляне пераходзяць да актыўных дзеяў: у ноч з 3-га на 4-ае кастрычніка яны перарэзалі тэлефонныя правады на вучастку Львоў-Стрый.

Пілсудчыкі ня скрываюць сваіх імпэрыялістычных замыслаў. Але яны баяцца што ў выпадку вайны супроць СССР іх паўзьмежныя вотчыны, якія заселены нацменшасьцямі, стануць на бок Савецкага Саюзу супроць польскіх паноў. Дзеля гэтага Пілсудзкі, пад апекай якога знаходзіцца ўкраінская буржуазія, імкнецца расьпечаным жалезам карных аддзелаў вытруціць ва ўкраінскіх працоўных нават думку аб магчымасьці паўстаньня супроць польскага панаваньня.

Сьцежкамі рускіх цароў

Політыка паноў зводзіцца да таго, каб селянін-украінец забыў сваю родную мову, забыў сваю нацыянальнасьць, ператварыўся у пакорнага апалячанага нявольніка. Пілсудзкі ў адносінах да Заходняй Украіны праводзіць тую-ж полі[ты]ку, якую расійскія цары прав[одзілі] ў адносінах да захопленай імі П[оль]шчы, якая нават іменавала[ся] Польшчай, а Прывісьлянскім кр[аем].

КОМСАМОЛУ



Пастаноўка агітпропгрупы комсамолу ў дзень выбараў у рэйхстаг.

НЯМЕЧЧЫНЫ



Насьценгазэта комсамолу ў ча[с вы]бараў у рэйхстаг з адзначэньнем [вынікаў] выбараў.

Хаваючы замучаных панскі[мі ка]тамі сваіх бацькоў, братоў і д[зяцей,] украінскія сяляне з зайздра[сьцю] глядзяць на сваіх савецкіх бр[атоў,] якія вольна будуюць соцыялі[зм у] вольнай Савецкай рэспубліцы

СТАЛІНСТАН ГАТОЎ ДА ПУСКУ!

Будаўнікам 1-й Белдрэс-комсамольскае прывітаньне

ГЭРОІЧНАЯ СЫМФОНІЯ

„Гвозди-бы делать из
этих людей,—
Крепче-бы не было в мире
гвоздей“.

Таварыш ЦЭКА!

Ужо прайшло больш гадзіны з доўчаканага ч су пуску магутнага турбагенэратара, а сэрца мае б'ецца яшчэ ўсхвалёвані і кроў струменіць па жылах хутчэй, чым звычайна.

Сеньня разгарнуўся ва ўсёй сваёй велічы і моцы, маўклівы дагэ-



Галоўны інжынэр т. Алейнікаў

ль, турбагенэратар. Грамоздкі і нябдымны, ён лёгка крануў сваё паўшыньне бязьлічу жале ных, сталёвых латоў, колаў і складаных мэханізмаў

Пробу мы рыхтавалі ўпарта і с а-ма. Манцёры і трубаправодчыкі, інжынэры і тэхнікі працавалі па 14-15 гадзін у суткі. Пасьля працы стом ена валіся на ложкі і раніцою, ледзь сьвітак, беглі ізноў на працу.

А 12-ай гадзіне ўночы 3 лістапада кіраўніцтва прызначыла пробны пуск. Манцёры, электрыкі, параправодчыкі, усім маленькія параўнаўча з турбагенэратарам, вольна пралазілі ў сутачныі яго труб і мэханізмаў, завінчывалі гайкі, ладзілі, стукалі, заўзята да бляску націралі паверхні турбіны.

Хвіліны паўзьлі марудна. Ледзь прыкметна, зусім не сьпяшаючыся, пасоўвалася стрэлка гадзіньніка. І з кожнай наступнай хвіліны нарастала хваляваньне.

А 12 гадзіне ўначы ў неабдымных прасторах машыннай залі сабраліс усе інжынэры і тэхнікі, нашыя кіраўнікі.

Трубы параправодаў ужо ўзарвалі машыню. У першы раз напоўніліся яны і заклёкаталі ад пару.

Стрэлкі вымяральных прыбораў ад паўзалі ад нуля ўсё далей і да ей. І з кожнай хвілінай расла трывога. Расло хваляваньне.

Рабочыя бегалі хутка, запыхаўшыся, па лесенках. Заг ды аддаваліся больш чотка і ўзнэрвавана гучэлі галасы.

Замежны высока-кваліфікаваны майстра—швэд Хігерстр н быў спакойны, як і заўжды. Ён павольна аглядаў часткі турбіны, вярцеў гайкі, спушчаўся ўніз да фундаманту, ладз ў інжэктар, насос, і ноў падымаўся на другі паверх да вымяральных прыбораў. Швэд Хігерстран, замежны майстра падзаў пр ўстаноўцы турбагенэратару бліскучы рэкордны тэмп. Сёньня

пры сустрэчы з намі, на заваленым пляцы, пры ўваходзе ў галоўны корпус, ён, Хігерстран, на нашыя паведамленьні аб ук ючэньні яго ў сьпіс лепшых з лепшых, спакойна адказаў: —„Ошень приятно“

Такім ён быў цяпер: згрупаваным і ўпэўненым.

А 3 гадзіне 53 хвіл. ночы Хігерстран павярнуў штурвальнае кола і турбагенэратар ажыў, паскараючы усё больш і больш кольк сьць абаротаў.

І р зам з ходам турба енэратара сьвятлелі твары ў людзей. Прысутныя віншавалі намесьніка галоўнага нжынэра Ас нбуду тав. Русанава з бліскучым пускам турбагенэратара.

Проба зроблена. Праз тры дні толькі тры лічаных дні, пачнуць сваю героічную сымфонію турбіны.

Мы вышлі з корпуса. Новыя гукі машын, бляск электрычнасьці будзілі балота.

Я аглядаюся на пройдзены шлях. М й дзён нік — верны спадарожнік трывог і адчаю, радасьці, перамог і ўпартасьці ўсіх нас — вядзе мане ў сты ь балот, у 1927 год. Я маленькі работнік будоўлі, часьцінка двухтысячнага атр ду рабочых і спэ ыялістых. Але мы разам можам сьмела заявіць наша у адз наму штурвальнаму—Цэнтральнаму Камітэту, што па загаду партыі і ўраду мы прывядзем у р х турбагенэратары і па слупох Асінстану, па дроту маланкай паімчацца дзесяткі тысяч кілёват электраэнэргіі,—на Віцебск, на Воршу, на Магілеў, на Копысь, на Шклоў.

* *
*

Жоўтыя, сьпісаныя старонкі. Кароткія запісы. Скупыя радкі ў пяцьдзесяць слоў узнымаюць з архіваў успамін людзей і часін.

Красавік і май 1927 году... Вясна. Расквітаюць дні. Разьліліся, разгуляліся балоты Арахоўскія, Выдрыцкія. Сяляне рыхтуюць нясеньні сеў. П лоскі вузенькія, як зрэнкі ў кітайцаў ці ман ол ў. Вада над балотамі—на мэтр. Пад ва ой гразкая глеба засасвае ногі, цягне ўніз.

... Выдрычане кажуць: — „Ужо 5 год, як тут па балоце ходзяць людзі прыежджыя з гораду, а што толку з гэстага“...

Ва ўн сон Выдрычанам, Арахоўцы пытаюцца: А што ты з балота зробіш, было балота і будзе балота.

Мы рыхтуем будову шосэ, падвозім пясок, шчэбень, капаем канавы. Засыпаем грэблі, кладкі і кладачкі. А на рабочым пасёлку: разбураныя каробкі хат, чорныя правалы вакон і вецер вольны — часты наведвальнік мясьцін разбурэньня.

Нас яшчэ зусім невялікая кучка рабочых, два інжынэры і чатыры тэхнікі, але мы ўпарта паўзем наперад і з кожным днём набліжаемся да артэры чыгуначных шляхоў. Мы зьвяжамся па рэйках сталёвымі бягунамі чыгункі.

Ліпень... Сем кілёмэтраў чыгуначнай веткі Хлюсьціна—Выдрыца адноўлены. Ветка Выдрыца—Арэхі пабудавана нанова. Шаша амаль скончана пракладкай.

І 11-га ліпеня кароткі запіс:—Урачыстая сэсія ЦВК БССР прыяжджала ў Выдрыцу, адбылася закладка Асінбуду...

Жнівень—верасень... Чаму так хмурны твары людзей,—будаўнікоў? Усё прыостаноўлена, спыніліся работы. Ёсьць загад з Масквы часова спыніць работу.

Загад ВСНГ і НК РСІ. Чаму? Высьвятляюць: праўда ці не, што пісалі ў св ёй заяве група інжынэраў-спэцыялістых Маскоўскага ДЭТ'у. А інжынэры пісалі на імя тав. Орджонікідзэ, Куйбышава і Кржыжаноўскага ліст, у якім даводзілі, што Асінстан кудзе шмат грошай каштаваць, лепш вось—раілі яны—пры кожным горадзе маленькую станцыю будаваць, — гэта дасьць вялікую экономію.

А хіба гэта шлях да нас? Мы ўзброіваемся калёнамі лічбаў, за я ія галасуе жыцьцё краіны, лічбамі мы растралялі довады грамадзян малавераў

З намі згадзіліся. Але-ж інжынэры высунулі тады другі варыянт. Яны даводзілі: у станцыі ня будзе спажыўцоў, бо наогул у БССР і прамысл васьці няма. Куды лезьці лапцюжнай краіне, краю балот і лясоў з будоўляй такой станцыі.

Яны гутарылі галасам сяброў, яны казалі, што хочуць навесьці на шлях, але ў сяброўскай размове гучэлі ноты здрадніцтва. А, ну іх...

Мы форсуем тэмпы будаўніцтва, шум малаткоў, сьціхшы раней, гучыць пераможна.

* *
*

На Асінбудзе працуе нямецкі манцёр Аўгуст Сьвенсон—высокакваліфікаваны кацельшчык — вадаправодчык. Грамадзкія організацыі Асінбуду, прэміюючы Сьвенсона, так запісалі аб ім у сваёй пастанове:—„Лепшы ўдарнік, працуе добраахвотна па 14—15 гадзін у суткі без выхадных дзён, заражаючы сваім прыкл дам рабочых цэху“.

Ён ня ведае расійскае мовы, але адно слова можна часта пачуць на монт жных работах галоўнага корпусу:

— Да-фай, дафай!.. Донэр, вэтэр... Дафай...

Гэта Аўгуст патрабуе тэмпаў ад сваіх беларускіх сатаварышоў па працы.

У рабоце плавяцца дні і ў днях плавяцца новыя людзі. Старыя нараджаюцца ў другі раз да жыцьця. і дні зьліваюцца з начыма, і ночы ўрастаюць у дні. Няма выхадных дзён. Аб іх часова забыліся рабочыя і працуюць, ня лічацца з часам.

* *
*

З кожнага лістка дзёньніка вы глядаюць першыя з перадавікоў,—заражаныя энэргіяй моладзі старыя і кемнай ухваткаю—моладзь. Я пазнаю вас—са сходаў партыйнага і комсамольскага колектываў, з нарад і зьлётаў ударнікаў.

Шміт—стары энтузіясты. Яго высоўваюць к узнагародзе ордэнам працоўнага сьцягу. За плячыма—37 год вытворчага стажу.

У дзёньніку—„Шміт ня вылазіць з кацельнай“,—у водзыве аб ім рабоч я запісалі:—„Шміт заўжды перакідваўся на найбольш адказныя вучасткі працы. Максымальна ўшчыльніўшы свой працоўны дзень, ён працуе па 14—15 гадзін у суткі. Паставіўшы працдысцыпліну і барацьбу за якасьць вышэй за ўсё, ён зрабіў сваю працу справай мужнасьці і гонару“.

Юсічаў—памоцн. машыністага, комсамолец-партыец, першы ўдарнік свайго цэху, добры грамадзкі працаўн к.

Зырын—малады 22-гадовы ўдумлівы тэхнік, комсамолец-партыец з творчай ініцыятывай, прараб па монтаж ы павышальнай станцыі. Ён—організатар ударнай брыгады, „ударны—бальшавік“, як запісана аб ім у характарыстыцы рабочых організацый. На вучастку Зырына—заўжды сапраўдна-бальшавіцкія тэмпы і бліскучае вырашэньне якасных паказчык ў.

Адзін за адным шчытнымі калёнамі праходзяць першыя шэрагі ўдарнікаў. Сва м бязьмежным энтузіязмам і напорнасьцю яны заражаюць электрычныя батарэі Ас нстану і тады самі акумулююць энэргію ў тысячы кілёват.

Інжынэр-электрык таварыш Сеўрук! Хто, як ня вы, першым падхапілі заклік партыі і ўраду даць краіне кадры. Організатар курсаў па па рыхтоўцы кадраў, вы, к пуску Асінстану, дасьцё 130-1 0 электраманцёраў, качагараў і машыністых. На гэтых курсах кіравалі вучобай ударнікі-інжынэры 85 проц. інжынэраў і тэхнікаў—моладзь савецкіх выпускаў.

Але хіба с арыя адстаюць?

Тав. Русанаў! Я ведаю, што вы начыма сьпіцё макс мум чатыры гадзіны. За апошн час і спаць некалі. На вас, вы ока-кваліфікаваным спэцыялістым, намесьніку галоўнага інжынэра ляжыць абавязак пасьпяховага пуску Асінэльстану. К XII гадав не вялікага Кастрычніка турбіны загамоняць мовай Ленінскай электрыфікацыі.

А Шчэрба Ніна, электра-манцёр моторыстка, ня толькі заваявала як жанчына месца на вытворчасьці, але як манцёр стала ў першыя шэрагі ўдарнікаў. Ніна — комсамолка, член партыі.

У жалезабэтонных сьценах карпусо нараджаецца новы чалавек. І зусім не пазнаць цяпер былога саматужніка, маляра Санкіна. Новічок у вытворчасьці, ён цяпер адзін з лепшых ударнікаў будаўніцтва. Санкін прэміяваны за рацыянальнае скарыстоўваньне матар'ялу і найлепшыя якасныя паказчыкі.

Запісы дзёньніка гавораць усё новымі і новымі прозьвішчамі энтузіястых інжынэраў і тарпавікаў, кіраўнікоў і машыністых, тэхнікаў і манцёраў, камандзіраў і радавых барацьбітоў—цэмантам рабочае арміі.

Гаеўскі—памоцнік машыністага часовай электрастанцыі прэміяваны як ударнік ужо два разы, зараз вылучан к узнагародзе ордэнам працоўнага сьцягу.

Іларывонаў—комуністы, інжынэр-будаўнік, застрэльшчык соцс а орніцтва сярод інжынэраў і тэхнікаў.

Данішэўскі—рабочы, партыец, чалавек, які зараз жыве і харчуецца толькі прапай па пуску станцыі. Сэкратар партыйнай о ганізацыі, кіраўнік штабам соцспаборніцтва ў баёх за станцыю.

Нэеровіч—інжынэр-ударнік, з нястомнай энэргіяй вытворчай ініцыятывы, увёў у сыстэму сваёй работы пе равыканьне калянарных планаў, пры найлепшых тэхнічных паказчыкзх.

* *
*

264 кілёмэтры апаясалі сеткі электрычных правадоў.

У Віцебск—„Дзьвіне“, акулярнай, Вітшвэю і дзесяткам віцебскіх фабрык; у Магілеў,—ску з воду. Мягвалакнабуду, „Днепроўскай Мануфактуры“. у Воршу—мясному і ільняному комбінатам; шклоўскаму „Спартаку“, Копысі—сілікатным заводам, цагельным; перадавым калёнам вёскі; колгасам Віцебшчыны, Аршаншчыны—нясуць драты электрычную зарадку і сьвятло.

Ужо цалкам электрыфікаваны падшэфныя будаўніцтвы: колгас „Чырвоны Прамень“ і савгас „Высокае“.

Побач з галоўным корпусам—пад адкрытым небам стаіць павышальная станцыя на 110.000 вольт. Увенчаная рознастайнымі ізолятарамі, ганарыста нясе яна драцяныя сьпляценьні ў розныя бакі ад станцыі,—роўнымі лініямі, праз балотныя туманы, вёскі і лясныя масывы.

На ўзгорку, побач з галоўным корпуса, вырас рабочы гарадок. Трохпаярховыя муры, упрыгожаныя бальконамі, сьвецяцца асьляпляючым бляскам вялікіх вакон.

20.000 кілёват энэргіі пацякуць па электрычных дратох Сталінстану на грані 13—14 год вялікага Кастрычніка. Але гэта яшчэ ня ўсё. У 1931-1934 годзе забруіцца 92.000 кілёват электрычнай сілаэнэргіі. Ужо забэтонаваны падмуркі другое чаргі Сталінстану.

Хутка ўздымуцца магутныя фэрмы новых карпусоў.

92.000 кілёват — гэта ў 4 з палов. разы павялічаны сёньнешні Сталінстан.

Апошнія рэшткі рыштаваньняў скінуты.



Нам. галоўнага інжэнэра т. Ша шнёў

Рубільнікі нарыхтаваны да ўключэньня.

Асінстан дае адказ на загады партыі, што гучэлі з трыбун XVI партзьезду.

— „Мы яшчэ пакажам нячуваныя ў гісторыі чалавецтва тэмпы“.

Бальшавіцкія тэмпы!

Ал. Ліпнёвы.

Асінстан,
4 лістапада 30 г.




ЭНТУЗІЯСТЫЯ АСІНБУДУ



А. Сьвінсон — Юсічаў — Шчэрба Н. — Русанаў — Іларывонаў





НА ФОТО: Зьверху—галоўны корпус (выгляд збоку); зьнізу зьлева на права: 1) устаноўка турбагенэратара, 2) павышальная падстанцыя магутнасьцю у 110 тысяч вольт.

АД ШТУРМУ ЗІМНЯГА ДВАРЦА— НА ШТУРМ УДАРНАЙ ПЯЦІГОДКІ

Наперакор прароцтвам правых ухілістых, якія ня вераць у нашыя сілы, пралетарыят, у саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, дасягнуў вялікіх посьпехаў у сваім социялістычным будаўніцтве

Комсамол--перадавы атрад змагаючагася пролетарыяту



НА АВАНПАСТОХ ПЯЦІГОДКІ

13 год існуе ўлада саветаў. 13 год ідзе магутная ўпартая барацьба па выкарчоўваньню рэштакаў капіталізму за ўрачыстасьці новага соцыялістычнага ўкладу.

Барацьба на франтох грамадзянскай вайны, а потым змаганьне за аднаўленьне соцыялістычнай рэконструкцыі гаспадаркі краіны—шлях 13 вялікіх год.

> Соцыялізм ня толькі не загашае спаборніцтва, а наадварот, —упяршыню стварае магчымасьць прыстасаваць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну такое працы, дзе яны могуць выявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе непачатая крыніца і якія капіталізм калечыў, усьціскаў, душыў тысячамі і мільёнамі.
>
> (ЛЕНІН).

Зьнішчыўшы капіталістычны лад, пролетарыят прыступіў да будаўніцтва новай соцыялістычнай экономікі. На гэтым шляху былі і ёсьць вялікія цяжкасьці, бо пролетарыят прыняў краіну з вялічэзнымі прасторамі і магутнымі прыроднымі багацьцямі цёмнай і адсталай без навукі і тэхнікі,— няпісьменную, загнаную царскім панаваньнем Расію і Беларусь.

Але—„самі цяжкасьці тояць у сябе мажлівасьці для іх перамаганьня" (Сталін). І таму неабходна максымальнае напружаньне пролетарыяту на перамаганьне цяжкасьцяй, на барацьбу за дасягненьне сваёй мэты.

Ленінскі комсамол увесь час ішоў у першых шэрагах барацьбітоў за соцыялізм. Па ініцыятыве комсамолу пачалося соцыялістычнае спаборніцтва, зьявілася шмат новых форм працы, жаданьня лепш скарыстаць свае сілы, усе мажлівасьці на справу перамогі над цяжкасьцямі, барацьбы за соцыялізм.

У апошнія дні, побач з вытворчымі манэўрамі, па шэрагу прадпрыемстваў пачаліся ствараццa штурмавыя сталёвыя брыгады,—верныя пасьлядоўцы тых штурмавых атрадаў, якія ў вялікія Кастрычнікавыя дні штурмавалі апошнюю апору контррэволюцыі— Зімовы Палац, а ў часы грамадзянскай вайны—Перакоп.

Да канца адданыя справе рэволюцыі і энтузіясты абавязваюцца ў любы час дня і ночы быць на варце. Па першаму закліку яны ідуць да варштата, каб не дапусьціць прарыву, а калі дапушчан—ліквідаваць яго.

Творчы энтузіязм працоўных накіраваны на фронт пяцігодкі. Ніякія хныканьі правых опортуністых, як у партыі, так і ў комсамоле, ня змогуць спыніць пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

> У Палесдруку вышла сыравіна, што пагражала прастоем некалькіх цэхаў. З фабрыкі „Гэрой Працы", з Добрушы, несваечасова даставілі сыравіну. Згрупавалася частка комсамольцаў і на маторнай лодцы накіравалася ў Добруш. Вельмі намучыліся хлопцы. Давялося на сябе цягаць маторную лодку, якая загразае на мелі, але комсамольцы ня падалі духам. Сыравіна была сваечасова дастаўлена і...
>
> Цэхі працавалі нармальнай чаргой.

13 год Кастрычнікавай рэволюцыі— 13 штурмавых год. Уперадзе яшчэ доўгая і ўпарная барацьба за пяцігодку, за соцыялізм. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і ў будучым штурме пераможам!

На чырвоныя палотнішчы занесены іх імёны

Летась, да 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі, Менскі скураны чырвонаштандартны завод „Бальшавік" стаяў перад фактам пазбаўленьня назвы чырвонаштандартнага за невыкананьне шэрагу паказчыкаў прамфінпляну. К XIII гадавіне Кастрычнікавай рэволюцыі завод падышоў з поўным выкананьнем прамфінпляну.

Рабочая кляса за апошні час высунула шэраг новых форм комуністычнай працы, пачынаючы ад соцспаборніцтва, ударных брыгад і канчаючы вытворчымі манэўрамі, сталёвымі брыгадамі і ўсесаюзным конкурсам.

Комсамольскі колектыў заводу, які складаецца з 100 чал., таксама мае ня мала заслуг перад заводам, перад краінай і рабочаю клясай. Упяршыню організованыя комсамольскія брыгады паказалі іншым рабочым, як можна і трэба працаваць. Вось комсамольская брыгада красільшчыкаў,— гэта адна з лепшых брыгад у хромавым цэху. Гэта яна сустрэчным прамфінплянам узьняла вытворчасьць працы, зьнізіла расцэнкі ў парадку соцспаборніцтва на 10 проц. Ня мае прагулаў і спазьненьняў на працу.

Вось брыгада рамшчыкаў—комсамольцаў. Гэта брыгада ня раз прэміявалася як да дня ўдарніка, так і да гадавіны соцспаборніцтва. Прозьвішчы лепшых брыгадзіраў можна ўбачыць на чырвоных палотнішчах, якія вывешаны каля кожнага цэху і заклікаюць пасьледваць прыкладу гэтых ударнікаў-перадавікоў соцыялістычнага будаўніцтва.

> Соцыялістычнае спаборніцтва і конкурэнцыя ўяўляюць два зусім розныя прынцыпы. Прынцып конкурэнцыі: паражэньне і сьмерць адных, перамога і панаваньне іншых. Прынцып соцспаборніцтва: таварыская дапамога адстаўшым з боку перадавых з тым, каб дабіцца агульнага пад'ёму. Конкурэнцыя гаворыць: дабівай адстаўшых, каб узмацніць сваё панаваньне; соцыялістычнае спаборніцтва гаворыць: яны працуюць дрэнна, іншыя добра, трэція лепш,—даганяй лепшых, каб дамагчыся агульнага ўздыму. (СТАЛІН).

У другой брыгадзе сьлесароў працуюць 40 проц. комсамольцаў. Брыгада кінута на пераабсталяваньне чырвонадубнага цэху—у другі хромавы. Яна адмаўляецца ад выхадных дзён, працуе па-ўдарнаму, максымальна скарыстоўвае старое абсталяваньне, чым дабіваецца значнай эканоміі. Хутка цэх будзе пушчан раней тэрміну.

Цікава падаць адзін прыкладны від працы комсамольскай брыгады фальцоўшчыкаў. Калі пачалі перазаключаць соцдагаворы, адна брыгада рабочых фальцоўшчыкаў узяла на сябе абавязак зьнізіць расцэнкі на 7 проц. Комсамольская брыгада зьнізіла на 10 проц., па яе прыкладу старыя рабочыя таксама зьнізілі расцэнкі. Гэта брыгада пры перазаключэньні соцыялістычных дагавароў узяла на сябе абавязкі:

> Шахта „Кастрычнікаўская Рэволюцыя" сыстэматычна ня выконвала свой прамфінплян. Крывая паўзла ўніз. Становішча было крытычнае.
>
> Перадавая шахта Арцёма вылучыла грамадзкі буксір і паслала на шахту. У склад буксіру ўвайшлі ўдарнікі, прадстаўнікі адміністрацыі і тэхпэрсоналу. Гэта група перадала свой вопыт слабой шахце.
>
> Дзякуючы буксіру шахта „Кастрычнікаўская Рэволюцыя" хутка ліквідавала свой прарыў.

Стварыць комсамольскі сустрэчны прамфінплян... Звычайны сустрэчны для нас малы.

Апоек, замест 200 штук, выпрацаваць 216.

Уключыцца ў конкурс на лепшыя брыгады.

Зьнізіць на 10 проц. расцэнкі на хлебныя аўчыны.

Лепшых ударнікаў падрыхтаваць партыю.

Зьнізіць брак, які перашкаджае выкананьню прамфінпляну, узяць шэфства над сябрамі-эрштатам, уважліва сачыць за ім.

Усё гэта дало пэўныя вынікі. Недарма за апошні час комсамольскі колектыў вырас на 25 проц. Недарма 15 лепшых таварышоў комсамолу перададзены ў партыю. Недарма 99 проц. комсамольцаў замацавалі сябе за заводам. І з усіх 23 проц. прагулаў ні воднага прагулу з боку комсамольцаў няма.

Комсамольскі колектыў правёў надзвычайна вялікую працу ў справе ўцягненьня заводу ва ўсесаюзны конкурс і ў барацьбу за якасьць.

Ёсьць ня мала недахопаў. Але яны губляюцца сярод агульных дасягненьняў заводзкага колектыву і комсамольскага ў прыватнасьці—як перадавой, адданай адзінкі.

Завод заслужыў званьне чырвонаштандартнага. Пэўная частка заслуг ордэну чырвонага сьцягу—сымболу рэволюцыйнай падзякі—які узьнялі ў рашучых крывавых бойках за Кастрычнік, належыць комсамольскаму колектыву. У барацьбе за пяцігодку, за ўзмацненьне краіны саветаў, гэты ордэн ён апраўдае.

З Мінкі...

> Упяршыню пасьля стагодзьдзяў працы на чужых, паднявольнае працы на эксплёататараў, зьяўляецца мажлівасьць работы на сябе і прытым работы, якая апіраецца на ўсе заваёвы навейшай тэхнікі і культуры.
>
> ... Організацыйных талентаў у сялянства і рабочай клясе шмат. І гэтыя таленты толькі-толькі пачынаюць уяўляць сябе, прачынацца, цягнуцца да жывое, творчае, вялікае працы, брацца самастойна за будаўніцтва соцыялістычнай грамады.
>
> (ЛЕНІН).

Шырэй дарогу ўдарным брыгадам— перадавым барацьбітом за соцыялістычнае будаўніцтва

ПЕРШЫ І НЕ АПОШНІ.



Кастрычнікаўская Рэволюцыя адчыніла вялікія мажлівасьці для выяўленьня творчага энтузіязму працоўных. Ударніцкі рух зьяўляецца магутнай зброяй у справе барацьбы за прамфінплян.

На здымку зьверху:—організатар першай ударнай брыгады ў СССР, рабочы кавальнага цэху Златаўстаўскага мэханічнага заводу імя Леніна, комсамолец тав. Сьмірноў. Ніжэй— тав. Дардык, найлепшы ўдарнік, энтузыясты сталёвай брыгады ЦЭС імя Леніна (Н.-Барысаў).

ПОЭЗІЯ ПРАЦЫ—НАМ ЛЕПШЫЯ ПЕСЬНІ

Апісаньне вытворчых процэсаў некалі ўвязвалі з песьнямі, жартамі і іншым.

У кругабезе нашых будняў—па ўсё свой час і месца. Сёньня штурмы пяцігодкі прыцягваюць увагу кожнае вытворчае адзінкі.

Вось ударны комсамольскі агрэгат фабрыкі „Кастрычнік".

Праца бяз сьпеваў...

... Суровыя будні.

Комсамольскі агрэгат стварыўся 25 верасьня 1930 году. За гэты кароткі час кожны рабочы фабрыкі навучыўся моцна стаяць на перадавых позыцыях свайго штурмавога вучастку. І сапраўды, калі жыцьцё прымусіла частку фабрыкі перайсьці на новыя асортымэнты вырабаў, комсамольскі агрэгат імя 16-га парт. зьезду першым кінуўся на гэты новы вучастак і ня гледзячы на навізну работы выканаў свой прамфінплян з перавышкаю.

— Такі гэроізм уласьцівы комсамольскаму агрэгату,—заяўляе член бюро комсамольскага колектыву тав. Казлоў.—Агрэгат ідзе першым.

Вядомы верасьнёўскі прарыў на „Кастрычніку" з усім уласьцівым комсамольскаму агрэгату энтузіязмам быў падхоплен на комсамольскі штурмавы буксір.

І ў адказ на пастанову партколектыву фабрыкі, па адозьве ЦК УсеКП(б) ліквідаваць прарыў да 15-га верасьня, комсамольскі агрэгат выканаў заданьне на 12-ае верасьня.

Астатнія агрэгаты выканалі гэта заданьне да 20-га верасьня.

Ня зьменшылася ўвага комсамольскага агрэгату да сустрэчнага прамфінпляну. Агрэгат даў сустрэчным перавышку продукцыі на 20 процантаў.

Усе навіны вытворчага жыцьця комсамольскі падхапляе першым. Комсамольскі агрэгат, раней за іншых падхапіўшы абвяшчэньне самакантролю, значна зьнізіў брак, пераробку і інш.

Значна зьніжан і сабекошт.

Як-жа з прагуламі?

Калі, да прыкладу, першы і трэці агрэгаты маюць у сярэднім па пяць прагулаў кожны, то комсамольскі ўжо к 3-му лістапада ня меў ніводнага прагулу.

Зараз атрад акунуўся ў штурмы вытворчых манэўраў. І тут бязвусыя энтузіястыя выдзяляюцца сваім уздымам, настроенасьцю, энэргіяй, захапленьнем жыцьцём.


Няма калі песьні сьпяваць, поэзія працы—нам лепшыя песьні. Хай шпарчэй сьпяваюць „Чырвоныя варонкі" і гофманскія прэсы. Гэта музыка захаплівае нас энтузіязмам. Гэтымі песьнямі захапіўся комсамольскі агрэгат фабрыкі Меншвэю—„Кастрычнік", які носіць імя 16-га партыйнага зьезду.

М. Варанецкі.



Рыхтуем надзейную зьмену

Руйнуюцца дзедаўскія межы,



расьце соцыялістычная Беларусь

ЛІЧБЫ НАСТУПЛЕНЬНЯ

Рост соцыялістычнага сэктару на вёсцы

Колгасы

Размах соцыялістычнага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы на Беларусі можна бачыць з наступных лічбаў: ужо ў 1920 годзе па ўсёй Беларусі былі організаваны 353 колгасы. Яны абагульнялі 1297 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і налічвалі 21.687 едакоў. Агульная зямельная плошча ў колгасах складала 26.308 га.

1927 год зьяўляецца годам бурнага росту колгасаў па Беларусі. Ужо ў гэтым годзе 994 колгасы аб'ядналі 8.499 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Агульная плошча пад колгасамі—94.458 га, з іх пахаці—49.553 га і пасеваў—[illegible].093 га.

У 1929 годзе налічваецца ўжо [illegible]713 колгасаў з 25.850 двароў. Агульная зямельная плошча пад колгасамі—336.720 га. З іх пахацьцю занята—175.668 га і пасевамі—134.688 га.

Увесну 1930 году колгасаў па Беларусі налічваецца 3.021, якія аб'ядналі 87.255 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Агульная зямельная плошча пад колгасамі—[illegible]200.128 га. Плошча пахаці—[illegible].655 га, пасеву—499.100.

Па ўсёй Беларусі ўжо ахоплена колгасамі 11,1 проц. усіх гаспадарак.

На 1-ае лістапада г. г. усіх колгасаў па Беларусі налічваецца [illegible]390, у іх двароў—97.223. Агульная зямельная плошча пад колгасамі—1.338.700 га. 12,5 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ахоплена колгасным будаўніцтвам. З кожным днём расьце новы колгасны прыліў і організоўваюцца новыя колгасы.

Савгасы

Разам з ростам усяе народнае гаспадаркі значна ўзмацнілася і будаўніцтва савецкіх гаспадарак. Савгасы Беларусі да XIII-й гадавіны Кастрычнікавай Рэволюцыі прышлі з вялікімі дасягненьнямі.

Колькасьць савецкіх гаспадарак за апошнія два гады павялічылася з 136 да 163. Адбываецца процэс організацыі новых савгасаў на цалінных землях, балотных масывах, на землях адрэзаных ад кулакоў. Пасеўная плошча пад савгасамі ў гэтым годзе павялічылася на 44 проц. супроць мінулага году. Ураджай галоўных збожжавых культур савгасаў значна павысіўся. Ураджай жыта ў 1927 годзе даў 9,9 цэнтнэраў з гэктару, а ў 1930 годзе—[illegible] цэнтнэраў. Ячменю ў 1927 годзе сабрана—5,9 цэнтнэраў, а ў 1930 годзе—9,8 проц.; Пшаніцы ў 1927 г. —9,6 цэнтнэраў, а ў 1930 годзе —12,4 цэнтнэра; аўса ў 1927 годзе —5,7 цэнтнэраў, а ў 1930 годзе—10,2 цэнтнэра.

Статак малочна-продукцыйнай жывёлы і маладняка па савгасах павялічыўся: з 6262 кароў у 1927 годзе да 28000 у 1928 годзе. Сярэдні гадовы ўдой статкаў буйнай рагатай жывёлы павялічыўся з 1424 літраў да 2045.

Савгасы далі значную агра-вытворчую дапамогу бядняцка-серадняцкім гаспадаркам. Ачышчана ў 1929-30 годзе бядняцка-серадняцкім насельніцтвам—30600 тон рознага збожжа. Апрацавана глебы па колгасах у часе асеньняга севу 3900 га. Адпушчана ў карыстаньне бядняцка-серадняцкаму насельніцтву сельска-гаспадарчага інвэнтару і машын на 9900 працоўных дзён.

Вызначана 12 буйных малочных фэрмаў на 12000 галоў, 5 буйных прамысловых птушка-трусовых заводаў і некалькі буйных садова-гародных савгасаў. Вызначана 70 сьвінаводчых гаспадарак у якія сёлета будзе пастаўлена ня менш 15000 сьвінаматак, а ў 1930-31 годзе—50000 сьвінаматак.

Савгасы закончылі раней усіх веснавую сяўбу. Супроць намечанага плянам Белсельрэсту 14947 га, засеяна ўвесну—17734 га. Уся плошча пашырана на 38 проц. супроць 1929 г.

* * *

Уборачная і асеньняя пасеўкампаніі па колгасах і савгасах Беларусі прашлі пасьпяхова, пасеўная плошча пад колгасамі пашырана на 9,6 проц. Савгасы ўборку скончылі на 7 дзён раней вызначанага плянам тэрміну. Уборка і пасевы ня горш прашлі і ў колгасах.

За дзьве дэкады верасьня ў БССР організавана 88 новых колгасаў, якія аб'ядналі 2059 бядняцка-серадняцкіх двароў. За дэкаду кастрычніка на працягу якое праводзіўся дзень „колектывізацыі і ураджаю" організаваны 151 колгас, у якія ўступіла 3994 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.



Тав. Ануарэў Пілп Васільлёў—старшыня колгасу „Авангард", рабочы 25-тысячнік, член КП(б)Б, вылучэнец заводу „Труды", адзін з лепшых ударнікаў колгасу.

Гавораць рапарты комсамольскіх перамог

З кожнай гадзінай, з кожным днём у горне клясавай барацьбы нараджаюцца новыя і новыя посьпехі перамог на фронце соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Не малую ролю ў здабытых ужо і новых перамогах адыгрываюць комсамольскія ячэйкі.

Вясковы комсамол многіх раёнаў зьяўляецца ініцыятарам у організацыі новых колгасаў, чырвоных абозаў хлеба, эшалёнаў бульбы і г. д. Комсамольскія ячэйкі ў сваіх колгасах паказваюць вузоры бальшавіцкай работы. Яны зьяўляюцца ініцыятарамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Аб гэтым гавораць рапарты перамог.

Узоры бальшавіцкай работы

Вось рапарт комсамольскай ячэйкі „Расьсьвет Пераможца" Жлобінската раёну.

„Ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай па праведзеньню колектывізацыі, што дало наступныя выпікі. Організаваны і замацаваны колгас „Кастрычнік" у вёсцы Цупер. У колгасе налічваецца 20 гаспадарак на плошчы ў 104 га.

Дзякуючы актыўнай рабоце комсамольскай ячэйкі, за час уборачнай кампаніі ў колгас „Расьсьвет Пераможца" уступіла 25 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Комсамольская ячэйка організоўвала ініцыятыўныя вярбовачныя групы па ўцягненьню ў колгас.

На час уборачнай кампаніі комсамольская ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай. комсамольскія брыгады паказалі лепшыя вузоры бальшавіцкай работы.

Маладзёжная брыгада за адзін дзень зжала больш жыта, чым іншыя брыгады за два дні.

Ударная брыгада касцоў выконвала свае заданьні за 6 гадзін, замест намечаных 8.

Вось што піша аб колгасе „Расьсьвет Пераможца" тав. Ц. Гарбуноў,

Ударнікі колгасных палёў

Вясеньні сеў колгас закончыў першым па Беларусі, за што атрымаў прэмію—трактар. Азімы сеў скончылі датэрмінова. Пасеяна 210 га жыта, 10 гектараў звыш пляну—у адказ на адозву ЦК УсеКП(б)—такі лёзунг колгасьнікаў. Уборка бульбы праводзілася мэтодам соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. На абвешчаны ячэйкай вытворчы паход адгукнулася моладзь аднаасобнікаў. штодзёна на ўборцы працавала 20—40 неколгасных дзяўчат.

Комсомолка Купсова, Старцава Ніна, Майсекава Дашка, Бобрыкава Варка, Камкова Марфа і шмат беспартыйных дзяўчат, ня глядзячы на працу ў аборы, добраахвотна абвясьцілі сябе мобілізаванымі па ўборцы жыта, ярыны і бульбы.

У касавіцу стварылі пад кіраўніцтвам комсамолу брыгаду з 415 чалавек. За 6 дзён пасушылі, перавезьлі і склалі ў стагі 15 га сена.

Ячэйка комсамолу прыняла самы актыўны ўдзел у складаньні пляну, які абгаварылі на сходзе ячэйкі. Сход вылучыў прадстаўнікоў з моладзі ў плянавыя групы...

Комсамольская ініцыятыва на мове лічбаў

Комсамольскія ячэйкі былое Магілеўскае акругі прынялі чынны ўдзел у колгасным будаўніцтве, правядзеньні ўборачнай і асеньня-пасеўнай кампаніі.

Сіламі ўдарных брыгад комсамольскай організацыі Чачэрскага раёну былі праведзены 16 суботнікаў па ўборцы ўраджаю, як у колгасах, так і ў індывідуальным сэктары.

У час уборачнай кампаніі ў Шклоўскім раёне па ініцыятыве комсамольскай організацыі організаваны 4 новыя колгасы з 704 гаспадаркамі.

У Клімавіцкім раёне організавана было 89 ударных брыгад з 1.475 чал., якія складаліся ў асноўным з комсамольцаў.

Комсамольская організацыя Астрашыцка-Гарадзецкага раёну ў дзень сьвяткаваньня XVI МЮД'у абвясьціла сябе ўдарнай брыгадай па ліквідацыі прарываў. Організацыя паслала ў савгас Вішнёўка 30 чалавек, якія абмалацілі 1.500 пудоў жыта і зьвязалі 250 коп аўсу. У дзень МЮД'у комсамольскімі ячэйкамі гэтага-ж раёну быў організаваны магутны хлебны паток, дзякуючы яму заданьне па хлебазагатоўках было выканана на 35 проц.

Эстафэтамі, агітпрабегамі ваюем за колгас

Комсамольскія ячэйкі пад кіраўніцтвам партыі ў барацьбе за новыя колгасы, за новых колгасьнікаў паказваюць усе новыя, вышэйшыя формы і мэтады работы.

„Па ініцыятыве комсамольскай брыгады агітпрабегу мястэчка Плешчаніцы былі праведзены сходы дружбы паміж колгасьнікамі і аднаасобнікамі. Пасьля сходаў 9 сем'яў з вёскі Стаец і 5 з Новай Слабады падалі заявы аб уступленьні ў колгас „Комінтэрн".

Комсамолія Случчыны ў дзень сьвяткаваньня XVI МЮД'у організавала падарунак комсамолу ў 10.000 пудоў хлеба. МЮД'аўскі струмень хлеба заліў усе вуліцы Слуцку. Хлебная МЮД'аўская эстафэта была організавана ўсімі ячэйкамі.

Па ініцыятыве комсамольскіх організацый Беларусі былі накіраваны ў Маскву 10 чырвоных эшалёнаў бульбы, рабочым усесаюзнай качагаркі Донбасу—5 і некалькі эшалёнаў рабочым гораду Леніна.

Адзін за адным эшалёны па бальшавіцку адпраўляліся на месца прызначэньня. Кароткія тэлеграмы Магілеў: „Пэршы эшалён бульбы ў Маскву адпраўляем 10 кастрычніка", і далей: „7-га організавана адпраўка з Слуцку эшалёнаў. Наладжана бесьперабойная адгрузка і прыём бульбы, організаваны ўдарныя брыгады..."

Працуем непакладаючы рук

Комсамольская ячэйка колгасу „Комунар" у сваім рапарце расказвае: комсамолія „Комунару" не пакладаючы рук працуе па організацыі новых колгасаў.

У выніку добрай працы комсамольскай ячэйкі:

„Сельсавет стаіць на першым месцы ў Чэрвеньскім раёне па выкананьню ўсіх кампаній на вёсцы. У нас організаваны тры колгасы і 1 ініцыятыўная група па далейшай вярбоўцы ў колгасы. Бульбазагатоўкі выкананы на 80 проц., хлебазагатоўкі—на 70 проц.

„Авангард" —у авангардзе

Адным з вузорных колгасаў і вузорных комсамольскіх ячэек зьяўляецца колгас „Авангард" і комсамольская ячэйка гэтага колгасу. Ячэйка мае каштоўны вопыт у сваёй працы.

Організаваны з двух карлікавых колгасаў у сакавіку 1930 году—колгас „Авангард" зараз налічвае 215 гаспадарак. Кулацкія спробы разваліць колгас, сарваць уборку атрымалі самы рашучы адпор. Ячэйка дала рашучы адпор быламу эсэру Маргевічу, падкулачніку, які імкнуўся ўзарваць калгас знутры.

Да зьезду ня прыйдзем з пустымі рукамі,—так гавораць комсамольцы ў сваім рапарце ЦК ЛКСМБ і газэце „Чырвоная Зьмена". І сапраўды:

Ячэйка прыняла на сябе цэлы шэраг абавязкаў.

Асноўныя з іх: сустрэчны плян давесьці да кожнага колгасьніка; організаваць пасты комсамольскай трывогі па мобілізацыі сродкаў, заблівым вопрыве, хлебазагатоўках, узяць шэфства над вёскай Гарань па ўцягненьню яе ў колгас; правесьці справаздачу колгасаў; скласьці вярбовачную камісію з колгасьнікаў і ініцыятыўныя групы з аднаасобнікаў.

Вырашаем мясную проблему

Паасобныя ячэйкі БССР ня дрэнна працавалі над адной з галоўных задач колгасна вытворчага паходу ў БССР—сьвінагадоўляй. Добры прыклад работы па сьвінагадоўлі і стварэньне кармовай базы—сілосаваньне падала комсамольская ячэйка колгасу імя 11-годзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі.


Пры закладцы бакшты сілоснай масай комсамольская брыгада на працягу 8 дзён працавала бязьзьменна з 7 гадзін раніцы да 10 гадзін увечары.

Атрад „лёгкай кавалерыі" ў ячэйцы організаваў налёт на праўленьне, дзе выявіў, што „атрыманыя яшчэ ў чэрвені месяцы гэтага году 10000 руб. на пабудову сьвінарніка, а ўсяго адпушчана 30 тысяч руб, да 12-VIII ляжалі нескарыстанымі. І зараз-жа пасьля налёту „ЛК" праўленьне прыступіла да будаўніцтва сьвінарнікаў"

* * *

Так, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, у бязьлітаснай барацьбе за генэральную лінію, змагаючыся з правым ухілам і „левымі" загібамі, комсамольская організацыя БССР сустракае XIII гадавіну Кастрычнікавай рэволюцыі яшчэ больш клясава загартаванаю, здольнай на выкананьне задач па аб'яднаньню мільёнаў бядняцка-серадняцкіх мас у колектыўныя гаспадаркі і ажыцьцяўленьню лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Х. Бацьвінік



МЫ ВЫРАСЬЛІ У ПОЛЫМІ, У ПАРАХАВЫМ ДЫМУ

Чырвоная армія--верны вартаўнік савецкіх межаў, абаронца соцыялістычнага будаўніцтва

Баявыя традыцыі франтоў—у практыку будаўнічых будняў

Пярэдадзень Перакопу

(З запісное кніжкі чырвонаармейца)

У жніўні 1920 году мы пакінулі польскі фронт. Брыгаду сьпешна пагрузілі ў г. Валачыску і накіравалі праз станцыю Апосталава на Ўрангелеўскі фронт.

* * *

Заўтра, на сьвітаньні, па пантонным мосьце ідзем церав Дняпро на Кахоўку. А там—стэп, а ў стэпе—стогнуць гарматы, трашчаць кулямёты. Ня будзе цішы і спакою. Ланцугом разьвінемся на полі, насустрач выпаўзуць грозныя танкі, загурчаць на нас гарматамі, засыплюць алавяным дажджом кулямёты, і зьмяшаецца кроў людзкая з конскаю. Хцівая зямля вып'е гэтую кроў.

Трупы загніюцца ад гарачыні і абдадуць смуродам стэпавыя травы...

Заўсёды вось такія думкі перад боем, лезуць яны ў галаву няпрошаныя.

— Ну, што-ж... Пачнем новы крымскі перагон! І калі гэтыя перагоны скончацца, людзі рабіцьмуць іншыя перагоны, а пра нашыя ўспамінаць будуць, гэроямі будуць называць і захапляцца!

А ўсё гэта ня так. Усё гэта—справа звычайная. Бяз гэтага нельга ісьці ў рэволюцыю, бяз гэтага немагчыма нідзе перамогі. У рэволюцыю пераможную пролетарскую едзем мы на пашах клячах. А калі гэтага мы хочам,—ня змогуць павярнуць нас назад ангельскія сталёвыя танкі і бранявікі. У нашай волі ёсьць жалеза! Першая шрубка соцыялізму будзе скавана з гэтага жалеза. Веруючы ў гэта, ідзеш на ўсё, церпіш нястачы. Успамінаючы потым дзівішся сам, што пераносіў гэтыя мукі...

* * *

Гэта была першая баявая ноч на паўднёвым фронце. Пасьля яе былі і іншыя... Але ня так моцна ўрэзаліся яны ў памяць, як гэта!

Трэ' было зьбіць працаўніка раптоўным ударам.

У яго больш людзей, кулямётаў і гармат. Полк яшчэ ў вёсцы сьпешыўся, каб ціха падысьці да варожых застаў. Рассыпаліся ланцугом. Крыху страшна стала, як застаўся адзін.

Эскадроны зьніклі ў цемры.

Справа і зьлева паўзьлі таварышы па разьдзелу. Часам дыстанцыя між намі так зьмяншалася, што чутно было дыханьне суседа. Каманда перадавалася шэптам.

— Той, хто неасьцярожна парушыць цішыню, няхай лепш не паўзе. Хто наважыцца закурыць—задушу, як сабаку!—так сказаў Жэлезаў перад боем.

Мы гэта самі добра ведалі: паўзьлі зусім ціха, як тысячы катоў, па спакойным стэпе.

Вось-вось тут, недзе ўперадзе, павінна быць варожая застава, а за яе сьпіною вёска з галоўнымі сіламі ворага.

Колькі яшчэ засталося паўзьці, ніхто ня ведаў. Здавалася, ня будзе канца гэтаму полю.

Раптам усе замерла, шэпты справа і зьлева: „Спыніць рух... Першаму, другому і трэцяму эскадронам застацца на месцы... Першы разьдзел трымае сувязь... Чацьвертаму... (у грудзёх задрыжэла,—куды-ж гэта чацьвертаму?) Падрыхтавацца і паўзьці далей!"

Чутно, як у грудзёх б'ецца сэрца. Вялікія кроплі поту робяць вільготнымі рукі і стрэльбу.

Загадалі ўдзесяцярыць асьцярожнасьць і быць нарыхтаванымі да атакі.

Значыць—блізка!

* * *

Дазоры 4-га эскадрону паўзьлі ўперад, а за ім ціхай хваляй каціўся полк.

Ноч цёмная - цёмная, цёплая, жнівеньская. Зямля яшчэ не астыла ад гарачага сонца, дыхае ў гарачы твар усімі пахамі старой травы і чарназёму. Уперадзе дазорнага ланцугу паўзе Жэлезаў. Ён, мабыць, ужо бачыць і адчувае, ня мыляючыся, варожыя заставы.

Ветрык павольна і прыемна абвеяў гарачы твар. Лёгкі халадок на адзін момант асьвяжыў нас. А сэрцу хочацца загадаць, каб яно не калапілася так моцна.

Вочы пранізваюць цемру ночы. Уперадзе чуць значна цёмная палоска межніку.

Дазоры спыніліся. Значыць, блізка,—мільганула думка. Сьціскаю стрэльбу. Цяпер хутка...

Вось ужо зусім добра чуваць, як управа ад нас шаркнуў бор. Сотні вачэй утаропілася туды. Па межніку нехта ішоў. Нарэшце, шагі замоўклі і мы ўбачылі ўрангелеўскі дазор. Калі ён зробіць яшчэ 10 крокаў, дык дойдзе да эскадроннага Жэлезава, які замёр пад межнікам.

Бразнула стрэльба выпаўшы з рук... Кароткая, бясшумная барацьба... Чуваць, як захрыпеў, захлёбваючыся крывёю варожы вартавы.

І зноў—ціха, ціха... Чакаем каманды.

— Эска-дрон,—плі!

Мы ўжо забыліся, што крыкнуў Жэлезаў. Здаецца, што нешта—мацернае. А потым ўсе закрычалі:—ура! Шалёна крычалі сотні галасоў.

Я таксама крычаў „ура", але ня чуў свайго голасу. Скакалі церав платы, выбягалі на вуліцу... Бягу, спатыкаюся на кінуты кулямёт. Падаю з усяго маху. Пад рукамі—вязкая кроў. Яна прыліпла разам з зямлёй да далоняй.

Загарэліся торпы саломы. Аднекуль паляцелі, выючы, пяжкія [...] рады і рваліся далёка з-заду за вёскай.

У промені кідаліся ўрангелеў[...] шмат якія з іх у адной бялізь[...]

Мы занялі вёску, а другія эс[...]роны пашлі далей,—туды, дзе с[...]налі гарматы... Канчалася ўжо [...]пакойная ноч. Сьвістала. Сланя[...] паранепыя. Як утрапёныя, нас[...] санітары з насілкамі.

Напружана кіпела праца на [...]равязачным пункце. Казалкі м[...] ў цёмных згустках крыві вал[...] па зямлі. Усюды бледныя т[...] нашых і чужых.

Заняўся дзень, а конны [...] зьбіраўся ў новы паход. Пры[...] пакінутых у тыле коняй. Выст[...]ліся.

Жэлезаў скамандаваў:

— На коняй—садзіся!

Дружна заляскалі стрэльбы і [...]цялкі. Скрыпнулі ангельскія с[...]

— Ну, таварышы, цяпер да [...]ракопу недалёка. Толькі-б да [...]му нам прабрацца, а там...—[...]зеў хвацка павярнуўся ў [...]тварам да эскадрону.—Запявай [...]ка!

Эх, гары, жыцьцё! Круці, [...] Пасьля такое справы і засьп[...] можна. Сып, сонца, гарачае зо[...] І паімчаліся ў стэп эскадроны, [...]маючы капытамі хмары пылу.

Андрэй Арэбі[...]

Бурнымі тэмпамі расьце краіна саветаў.

Дзесяткі новых гігантаў, тысячы кілёмэтраў сталёвых чыгуначных рэек акутваюць неабдымныя прасторы Савецкага Саюзу. Там за мяжою ціха і маўкліва стаяць прамысловыя заводы. Ня дымяць трубы, ня гудуць гудкі.

Толькі шпаркім тэмпам, без адпачынку і перапынку працуюць гіганты ваеннай індустрыі, выпрацоўваючы сродкі вядзеньня вайны.

Толькі ў гэтай галіне прамысловасьці капіталістычных краін крызісу няма.

13 год расьце і будуецца краіна саветаў. Кожны дзень, кожную гадзіну наша будаўніцтва наносіць усё новыя, магутныя ўдары па старым, загніўшым капіталістычным ладзе.

Уперадзе—шматлікія бойкі на фронце будаўніцтва краіны, рэконструкцыі яе гаспадаркі. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі краіна ідзе да далейшых посьпехаў.

Няпрымірымыя клясавыя бойкі ўперадзе! Чырвоная армія—верны вартаўнік саветаў—неаднакраць давяла сваю здольнасьць біць руйнуючым ударам па ўсіх тых, хто пасягне на заваёвы Кастрычнікавай Рэволюцыі.

Гісторыя Чырвонае арміі—гісторыя Кастрычніка.

Вывучаючы баявыя традыцыі Чырвонай арміі, будзем мацаваць сувязь з яе часткамі, змагацца за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны саветаў.

„Ніводнае пядзі чужой зямлі не жадаем, але і ніводнага вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому». (Сталін)

І кожны, хто пасягне на заваёвы Кастрычніка, атрымае сакрушальны адпор ад слаўнай Чырвонай арміі.



— Ніхто шляху пройдзенага ад нас не адбярэ!

Новы гігант соцыялістычнай індустрыі

7-га кастрычніка пускаецца першая чарга Магілеўскай фабрыкі штучнага шоўку

Цагліна за цаглінай растуць новыя соцыялістычныя гіганты. Савецкі саюз становіцца магутнай індустрыйнай краінай.

7-га кастрычніка ўвойдзе ў строй барацьбітоў за соцыялізм такі гігант як Магілеўская фабрыка штучнага валакна. Абсталяваная па апошняму слову тэхнікі, яна па сваёй магутнасьці будзе адной з буйнейшых фабрык штучнага валакна ў СССР. Прапускная здольнасьць фабрыкі—1300 тон у год, альбо чатыры тоны ў дзень. Кажучы больш зразумела—кожныя суткі фабрыка будзе даваць штучнага валакна на 40.000 мэтраў матэрыі, альбо на 50.000 пар панчох. Разам з гэтым, новы гігант пазбаўляе „нашу тэкстыльную прамысловасьць, у зьвязку з слабым яшчэ разьвіцьцём бавоўнаводзтва, ад імпорту сыравіны з капіталістычных краін.

7-га будуць пушчаны ў ход першыя дзьве машыны на 192 верацяны. Разам з гэтым ужо змонтыраваны яшчэ 4 машыны, якія ўвойдуць у строй на працягу лістапада месяца, а на працягу 1931 году, до 1-га кастрычніка, у строй змагароў увойдуць усе 4.000 верацён. Новы гігант прыме ў шэрагі рабочае клясы новых 2.000 чалавек.

Выкарыстоўваючы сапраўдныя комуністычныя мэтады працы, рабочыя Магвалакнабуду, пад кіраўніцтвам партыйнага колектыву, пры актыўнай працы комсамольскага колектыву і ўсяго адміністрацыйна-інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу, паказалі сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы. Пабудова фабрыкі будзе скончана ў 15 месяцаў, замест 18 месяцаў па пляну. Першая чарга пушчана да тэрміну.

Соцспаборніцтва і ударніцтва былі асноўнымі мэтадамі працы. 1500 ударнікаў рабочых, 122 ударнікаў комуністыя, 215 комсамольцаў, 89 інжынэраў—вось колектыў гэрояў ударных бальшавіцкіх тэмпаў.

Каля 145 лепшых з іх асяродзьдзя былі прэміяваны кіраўніцтвам пабудовы, а 4 беспартыйных рабочых — Снопаў, Сацін, Шведкаў і комсамолец Ткачоў — прэміяваны ВСНГБ.

Праўда, побач з гэтым былі і прарывы ў іх працы. Шмат сэзонных рабочых толькі ўпяршыню прышлі на вытворчасьць, прынесьлі з сабой адсталыя настроі, няўменьне працаваць па-комуністычнаму. Навічкі адставалі і тармазілі агульныя тэмпы работы. Не хапала і кваліфікаваных рабочых рук. Усё гэта спрыяла таму, што ў паасобных галінах працы ня выконваўся прамфінплян. У прыватнасьці па монтажным аддзяленьні ў кастрычніку недавыканалі прамфінплян на 8-10 проц., што пагражала своечасоваму пуску фабрыкі. Але партколектыў своечасова дагледзіў гэта і заклікаў рабочых штурмам узяць усю сотню. З 25-га кастрычніка па 1 лістапада абвешчан штурм на пабудовах. Шырока разгарнулася масавая праца. ІТР выпрацаваў ударна-опэрацыйныя пляны працы. Да 1 лістапада прарыў быў ліквідаваны і прамфінплян выканан з перавышкай.

Для мобілізацыі энтузіязму рабочых партколектыў выпусьціў сьцяг імя партколектыву. Першым заваявала яго мэханічнае монтажнае аддзяленьне. Разгарнулася барацьба за сьцяг, за пяршынства. Рабочыя ВО пасілілі тэмпы і перагналі монтажнікаў. Усю працу па электраправодцы, зьвязаную з пускам фабрыкі, яны скончылі да 3 лістапада, чым заваявалі права на пераходны сьцяг.

Але-ж барацьба за тэмпы ня скончана. Першага лістапада робіцца праверка падрыхтаванасьці да пуску фабрыкі. Знашліся „хвосьцікі" ў выкананьні пляна ў. Мобілізуюцца рабочыя на штурм апошніх перашкод. З 1-га лістапада абвяшчаюцца вытворчыя манэўры.

Збудаваная энтузіязмам і энэргіяй рабочых, фабрыка 7-га запрацуе поўным ходам.

Гаворачы аб энтузіязьме рабочых мас пабудовы, нельга не адзначыць у гэтым вялікае ролі комсамольскай організацыі. Райком комсамолу правёў шэраг мобілізацый комсамольцаў на ліквідацыю прарываў (адпрацавана 2000 чалавека-дзён). Ячэйка мэханічнага цэху была першым творцам сустрэчнага прамфінпляну, скараціўшы на 18 проц. тэрмін выкананьня даручанай мэханічнаму аддзелу пабудовы. ЦК ЛКСМБ мобілізаваў на ліквідацыю прарываў 105 комсамольцаў. Пры іх дапамозе рабочыя пабудовы выканалі прамфінплян на 100 проц. узьняўшы яго з 77 — 80 проц., якія значыліся на 15-га кастрычніка. Гэтыя факты красамоўна сьведчаць аб вялікай энэргіі і энтузіязьме комсамолу.

Рос корпус, новай фабрыкі, а разам з ім рос і каваўся новы чалавек. Фабрыцы патрэбны кадры, патрэбны спэцыялістыя, а іх так мала ў СССР. Аднак, намогай партыйных грамадзкіх організацый і інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу заправім і гэтую прабоіну. Пры інтэнсыўнай працы тэхнічных сіл фабрыкі на вопытнай ўстаноўцы за 6 мес[...] падрыхтавана 300 чалавек к[...]фікаваных рабочых, а да 1-га [...]дзеня 1931 году будуць падры[...]ваны яшчэ — 114 чалавек [...]тая колькасьць кваліфікаваных [...]бочых цалкам забясьпечыць [...] трэбы фабрыкі на першы час.

ФЗВ разам з далейшым разь[...]цём фабрыкі будзе тут-жа [...]ваць соцыялістычныя кадры [...]нікоў машын. Шмат цяжкас[...] ужо перамаглі. Але перад раб[...] фабрыкі стаяць яшчэ вялік[...]дачы.

Да XIII гадавіны Кастрычні[...] Рэволюцыі ўваходзіць у калёны [...]рацьбітоў толькі 192 верацён [...] усіх 4000. Наперадзе яшчэ [...]кая праца. Яна патрабуе ад [...]тыйнай і комсамольскай орг[...]пый, ад колектыву рабочых і [...]жынэрна-тэхнічнага пэрсоналу [...]будовы яшчэ больш упартага [...]ганьня за далейшыя, яшчэ бол[...] перамогі. Патройваючы тэмпы [...]цы, мы павінны бальшавіцкімі [...]камі, у найкарацейшы тэр[...] прыйсьці да фінішу пабудовы [...]рыкі.

Чым хутчэй і лепш мы [...]будаваць, тым хутчэй выкана[...]станову 16 Зьезду ЎсеКП(б) [...]мацненьні тэмпаў будаўніцтва [...]кай прамысловасьці, на асно[...]ных посьпехаў індустрыялі[...] СССР.

К. [...]

ПАД ЛЕНІНСКІМ СЬЦЯГАМ

будуем нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу культуру

КОМСАМОЛ, НА БАРЫКАДЫ КУЛЬТУРНАГА ФРОНТУ!

Мы маем шэраг дасягненьняў і посьпехаў, шэраг прасоўваньня наперад і ў справе будаўніцтва нашай нацыянальнай культуры. Мы зьяуляемся, напрыклад, перадавой рэспублікай, першая з усіх рэспублік Савецкага Саюзу, увёўшай усеагульнае абавязковае навучаньне.

Мы адкрылі ў 1929-30 г. 1437 новых комплектаў школ і ахапілі школамі амаль 90 проц. дзяцей узросту ад 8 да 11 год. Мы маем значныя посьпехі і ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Мы маем прасоўваньне наперад і ў пытаньні стварэньня пролетарскіх кадраў.

(З дакладу т. Гея на XIII зьезьдзе КП(б)Б.



Кастрычнікаўская рэвалюцыя 1917 г. застигла Беларусь аднэй з самых адсталых краін царскай Расіі.

Прыгнечаная царом нацыя стагнала пад ярмом яго лёкаяў.

Экономічна адсталаю, з напалову няпісьменным насельніцтвам, з дзе-ні-дзе раскінутымі расійскімі школамі, без адзінай беларускай школы, пры поўнай адсутнасьці вышэйшых навучальных устаноў, з амаль няіснуючай нацыянальнай культурай прышла Беларусь да Кастрычніка 1917 году.

Белапольская окупацыя, Булак-Балаховіч і да яго падобныя дабілі і тыя значныя праблескі культуры, якія прабіваліся скрозь цэнзуру самаўладзтва.

І толькі пасьля вызваленьня Беларусі ад белапалякаў у 1920 годзе—Савецкая Беларусь пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі пачынае выпраўляць свой горб.

Руйнуем спадчыну мінулага

Крок за крокам аднаўляецца народная гаспадарка. Замест зруйнаваных пажарамі белапольскай окупацыі фабрык і заводаў—рэспубліка пакрываецца будаваньнямі новых корпусаў.

Удыхнуўшы з палёгкай, рабочая кляса і сялянства пад кіраўніцтвам компартыі ў саюзе з працоўнымі ўсяго СССР пачынаюць будаваць сваю пролетарскую культуру.

„У краіне няпісьменнай соцыялізму будаваць нельга", і па Беларусі разьвіваецца сетка новых школ.

4.533 школы чатырохгодкі налічвалася ў 1925-26 годзе, 4.900—у 1926-27 годзе. 5.163—у 1927-28 годзе 5.696—у 1929-30 годзе.

Школы няпісьменных, сямігодкі і цэлы шэраг іншых відаў школ густой сеткай пакрылі Беларусь, якая першая ў Савецкім Саюзе абвясьціла ўсеагульнае навучаньне. На працягу 1930-31 г. мы павінны зьнішчыць праклятую спадчыну мінулага—ліквідаваць няпісьменнасьць усяго насельніцтва.

Пры самаўладзтве на Беларусі не было ніводнае вышэйшае навучальнае установы. А зараз, за 10 год свайго існаваньня, Беларускі Дзяржаўны Універсітэт даў краіне 2.592 чырвоных спэцыялістых. Амаль столькі-ж студэнтаў БДУ рыхтуюцца ўзяць каманданыя вышыні соцыялістычнага будаўніцтва. Па Беларусі існуе 12 вышэйшых навучальных устаноў.

Хэмічная прамысловасьць—адна з самых адсталых галін у нашай гаспадарцы—уклала свой скарб у соцыялістычную будоўлю рэспублікі—Фізыка-тэхнолёгічны Інстытут.

Закінутая, прыгнечаная ў мінулым Беларусь дае краіне чырвоных спэцыялістых.

Разгортваецца політэхнізацыя. Растуць фабрычна-заводз ія сямігодкі, ФЗВ, ШКМ, пераможным маршам, пачатая па ініцыятыве комсамолу, пройдзе культ'эстафэта, да фінішу—IX зьезду ЎсеЛКСМ, і вынікам яе будзе значнае прасоўваньне ўперад нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Творым пролетарскую культуру

У лапцюжнай, цёмнай Беларусі пад гнётам царскіх абшарнікаў не магла разьвівацца нацыянальная культура.

Кастрычнік прынес з сабою дзесяткі, сотні пролетарскіх, ад варштата і сахі, пісьменьнікаў, якія твораць сваю нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу, літаратуру.

Хутка расьце літаратурны маладняк, зьвязаны многімі ніцямі з нашым соцыялістычным будаўніцтвам, адлюстроўваючы яго ў сваіх творах.

Расьце наш друк. Зараз у гарадох Беларусі выдаецца 18 газэт, на мовах усіх нацыянальнасьцяй, з тыражом





звыш 600 тысяч экзэмпляраў. Большасьць фабрык, заводаў, буйных колгасаў маюць свае друкаваныя шматтыражкі. У сувязі з ліквідацыяй акруг, утвараецца звыш 30 новых раённых газэт.

Мільёны рабочых і сялян, няпісьменных пры самаўладзтве, маюц магчымасьць чытаць газэты на сваёй нацыянальнай мове.

Загартоўваемся ў барацьбе

Капіталістыя не клапаціліся аб утварэньні мала-мальскай культуры для прыгнечанай нацыі. Кастрычнік разам з вызваленьнем прынёс Беларускай рэспубліцы імкненьне аўладаць культурай.

Зараз ужо не знайсьці на Беларусі вёскі, якая-б ня мела хаты-чытальні, не знайсьці раёну, які-б ня меў радыё. Густою сеткай клюбаў пакрыты гарады і вёскі Беларусі.

З ростам прамысловасьці і сельскай гаспадаркі значна ўзрасла патрэбнасьць рабоча-сялянскіх мас у пролетарскім мастацтве.

Мы маем тры дзяржаўныя стацыянарныя тэатры, з іх адзін яўрэйскі, 4 тэатры-перасоўкі розных нацыянальнасьцяй, прызначаных для абслугоўваньня вёскі, асабліва колгасаў.

За час праведзенага комсамолам трохмесячніку беларускай нацыянальнай культуры мы ўтварылі тэатр рабочае моладзі—гэты мастацкі агітпроп комсамолу, які, зьяўляючыся тыпам соцыялістычнага тэатру, ідзе на зьмену тэатру старых традыцый. Зараз мы ўтварылі яўрэйскі ТРАМ.

У Менску адчынілася новая студыя—опэры і балету, якая павінна выхаваць актыўнага змагара соцыялістычнага будаўніцтва, дапаможніка рабочага ў яго барацьбе за культуру нацыянальную па форме і пролетаркую па зьместу.

Кіно—лепшы агітатар і організатар мас на барацьбу за соцыялізм, заняў выдатнае месца ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Кожны раён мае кіно-перасоўку, амаль усе фабрыкі і клюбы маюць свае кіно ўстаноўкі.

Гукавое кіно „ЗОРКА", якое ў 13-ю гадавіну Кастрычнікавай Рэволюцыі адчыняецца ў Менску, сьведчыць ня толькі аб культурным, але і аб шпаркім тэхнічным росьце савецкай краіны.

Нядаўна пабудаваны унівэрсытэцкі гарадок, які зьяўляецца адным з лепшых у Савецкім Саюзе, будаўніцтва новых тэатраў, клюбаў, кіно, нардамоў гавораць аб нясупынным культурным росьце рабоча сялянскіх мас Савецкай Беларусі.

Разьвіцьцё нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу культуры праходзіць у жорсткай барацьбе з нацыянал-дэмократызмом і нацыянал опортунізмамі, якія імкнуцца замацаваць свой уплыў на культурным фронце.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б рабочая кляса і сялянства выкрывае носьбітаў правага ўхілу, нацыянал-дэмократызму, нацыянал-опортунізму, велікадзяржаўнага шовінізму як галоўнай небясьпекі і шавінізмаў розных колераў вядзе рашучую барацьбу за ўзмацненьне пролетарскай культуры.

Жорсткая барацьба з усімі правaопортуністычнымі, нацыяналістычнымі і шовіністычнымі элемэнтамі замацоўвае дасягненьні і яшчэ больш шпаркімі тэмпамі разьвівае пролетарскае культурнае будаўніцтва БССР.

Так пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі Савецкая Беларусь будуе сваю пролетарскую культуру.

Э. К.

Растуць кадры пролетарскай літаратуры

Растуць і ўзмацняюцца шэрагі пролетарскіх пісьменьнікаў.

Цэнтральная літаратурная рабочая студыя БелАПП'у зьяўляецца сьведкаю гэтага росту. 23 пролетарскіх маладых пісьменьнікаў аб'яднаны студыяй.

ЦРЛС—школа пролетарскага літаратурнага маладняка. Яна рыхтуе ня дробна-буржуазную труxлядзь, а змагароў за соцыялістычную перабудову гаспадаркі. Аб гэтым сьведчыць творчасьць маладых пісьменьнікаў-студыйцаў.

Штодзённая ўпартая работа ў літаратурных рабочых гуртках на прадпрыемствах, змаганьне поплеч з рабочай клясай за выкананьне пяцігадовага пляну за чатыры гады, за ліквідацыю прарываў у прамфінпляне—вось галоўныя задачы ў штодзённай рабоце кожнага студыйца паасобку і студыі цалкам.

Фабрыкі, заводы, рабочае асяродзьдзе,—тут наша месца.


Наша творчасьць крок у крок павінна ісьці з гіганцкімі тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва, а крыніцай для яе павінна быць работа завода, колгас і змаганьне за яго, клясавая барацьба—яе паказ у разрэзе зьнішчэньня варожых нам клясаў.

Нашыя студыйцы,—актыўныя змагары за выхаваньне пролетарскіх пісьменьнікаў.

М. Процька.



...І ВЫРАСЬЛІ ДВАРЦЫ КУЛЬТУРЫ (Унівэрсітэцкі гарадок у Менску)



РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ШКВАЛ ШТУРМУЕ ПАДПОРЫ КАПІТАЛІЗМУ

Ад рэволюцыйнай профопозыцыі пролетарыят ідзе да рэволюцыйнай профорганізацыі

Набліжаюцца рашаючыя бойкі

Прадвыбарны тэрор у разгары

ВАРШАВА, 4. Прадвыбарны тэрор у разгары. Адным з яго праяў зьяўляецца агітацыя за адкрытае галасаваньне за беспартыйны блёк. Назначаны ўжо коменданты калён, якія будуць адкрыта галасаваць за ўрад.

Сьпісы цэнтра—левага опозіцыйнага блёку ануляваны ў 14 акругах, па якіх на мінулых выбарах партыі цэнтра-левага блёку атрымалі звыш 60 мандатаў.

Учора адбылася ў Варшаве рабочая дэмонстрацыя, організаваная анты-фашысцкім блёкам. У сутычцы з паліцыяй ранен адзін паліцэйскі і адзін удзельнік дэмонстрацыі. Па меры прыбліжэньня выбараў ўзмацняецца тэрор супроць рэволюцыйных рабочых і сялян. У Ўладзіміры-Валынскім арыштавана па падазрэньню ў комуністычнай дзейнасьці 50 чалавек у працягу аднэй начы. У Вільна таксама ўтвораны масавыя арышты.

„...Тое, што здарылася ў вёсцы, забараняецца пісаць...“

ВАРШАВА, 4.—У многіх школах Заходняй Украіны сялян прымушаюць падпісваць спэцыяльныя дэкляраціі, 4-ты пункт якіх гаворыць: „Мы протэстуем супроць таго, што нас называюць украінцамі, так як мы заўсёды былі, застанемся цяпер і будзем русінамі“.

Украінскія газэты за апошнія дні кастрычніка мільгацяць наступнымі характэрнымі паведамленьнямі: „У вёску Дабразода прыбыў эскадрон улан. Дзяўчаты, маладыя жанчыны і сьвядомыя сяляне начуюць у лесе“. Другое паведамленьне гаворыць: „У вёсцы Данырьчы пабывала карная экспэдыцыя. Тое, што здарылася ў вёсцы, забаронена апісваць“. Такой эзопаўскай мовай апісваецца не цэнзурнай умовай тая крывавая гісторыя, якую перажывае цяпер большасьць вёсак на Заходняй Украіне. Як паведамляюць польскія газэты, „падпальнікі“ перанесьлі „сваю дзейнасьць з Усходняй Галіцыі на Валынь“. У Роўна ўжо арыштавана 20 украінцаў па абвінавачваньню ў сабатажы.

Шукаюць шляхі для зьмягчэньня крызісу

БЭРЛІН, 4.—У колах прадпрыемцаў і рэформісцкіх профбюрократаў працягваецца абгаварэньне пытаньня, у якой форме ажыцьцявіць паніжэньне жыцьцёвага ўзроўню рабочых мас, каб паслабіць вастрыню гаспадарчага крызісу.

Учора адбылося пасяджэньне аб'яднаньня нямецкіх саюзаў прадпрыемцаў. Прадпрыемцы зноў выказаліся за тое, што неабходнае скарачэньне выдаткаў вытворчасьці можа быць дасягнута толькі шляхам яўнага скарачэньня зарплаты і павялічэньня рабочага часу без павялічэньня зарплаты.

Колькасьць беспрацоўных, як вядома, нават па афіцыйных лічбах, ужо правышае 3.100.000 чалавек і ў бліжэйшыя месяцы чакаецца далейшы вялізарны рост беспрацоўя.

Крывая ідзе ўніз

НЬЮ-ЁРК, 21.—За 9 месяцаў 1930 году продукцыя аўтомобільнай прамысловасьці Злучаных Штатаў упала, у параўнаньні з тым-жа пэрыодам мінулага году: з 5.541 тысяч да 2.928 тысяч штук аўтомобіляў. Колькасьць праданых аўтомобіляў у жніўні—на 20 проц. ніжэй, чым у ліпені 1930 г. і на 50 проц. ніжэй, чым у верасьні 1929 г. Звычайна-ж жнівень дае павышэньне збыту на 2 проц.

Дубцамі зьбіваюць тых, хто патрабуе працы

НЬЮ-ЁРК, 2.—Паліцыя разагнала організаваную комуністымі дэмонстрацыю пад лёзунгамі барацьбы з беспрацоўем і іншымі прадвыбарчымі лёзунгамі компартыі Амэрыкі. У дэмонстрацыі ўдзельнічала 1.000 рабочых. Паліцыя зьверскі зьбівала дэмонстрантаў.

Паліцыя напала на вёску Бельгаўм

ЛЁНДАН, 4. Як паведамляюць з Бамбэю, уночы паліцыя напала на вёску Бельгаўм (блізкая ад Бамбэю), дзе сяляне будуюць дарогу супроць волі ўраду. У выніку паранена 12 сялян і 12 паліцэйскіх.

23.136 індыйцаў сядзяць у турмах

ЛЁНДАН, 4. Ангельскі міністр па справах Індыі заявіў у палаце абшчын, што ў сучасны момант у турмах знаходзяцца 23.136 індыйцаў-удзельнікаў кампаніі грамадзянскага непаслухмянства.

У КРАІНЕ „СВАБОДЫ І ДЭМОКРАТЫІ“ ЗЬБІВАЮЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ



16-Х, па ініцыятыве комуністых, дэлегацыя Нью-Ёркскіх беспрацоўных ва чале з т. Энгдолем зьявілася на паседжаньне нью-ёркскага муніцыпалітэту і спрабавала ўручыць муніцыпалітэту патрабаваньне аб аказаньні дапамогі беспрацоўным. Мэр Нью-Ёрку выклікаў паліцыю, якая жорстка зьбіла ўдзельнікаў дэлегацыі. У той-жа час перад памяшканьнем муніцыпалітэту адбылася шматтысячная дэмонстрацыя беспрацоўных. На дэмонстрацыю напала конная паліцыя і зьверскі зьбіла дэмонстрантаў. Многія з дэмонстрантаў цяжка паранены. Дзесяць чалавек, у тым ліку т. Энгдоль, арыштаваны.

На здымку: паліцыя арыштоўвае беспрацоўных.

Сілы паліцыі кінуты супроць рэволюцыйнага сялянства

ТОКІЁ, 3. Як паведамляюць з Харбіну, улады ў Чухо, на паўднёва-усходняй лініі К.-У. чыгункі, кінулі буйныя сілы паліцыі ў вёскі для барацьбы з рэволюцыйным сялянствам. Паліцыя арыштавала 60 сялян, абвінаваціўшы іх „у падрыхтоўцы комуністычнага паўстаньня“.

Комсамол створыць пролетарскую абарону—маладую гвардыю

ПАРЫЖ, 31. З прычыны 10 гадзьдзя францускага комсамолу, ЦК францускае компартыі і комсамолу публікуюць адозву да ўсяе працоўнае моладзі Францыі.

Адозва адзначае неабходнасьць, у адказ на фашысцкія і соцыял-фашысцкія рэпрэсіі, організаваць сваю пролетарскую абарону і стварыць маладую гвардыю. Перад тварам нарастаючай пагрозы вайны, працоўная моладзь заклікана выступіць супроць імпэрыялістычнае бойні ў абарону СССР. У заключэньне ЦК комсамолу і компартыі заклікаюць моладзь да рашучай барацьбы за ўладу рабочых і сялян, за дыктатуру пролетарыяту.

Працоўнае сялянства в... ступае на абарону СС...

ПАРЫЖ. Генэральная конф... цыя працоўных сялян Францы... блікуе ў сваім органе „ВУА ... зан“ адозву, прысьвечаную ... гадавіне кастрычніка. Адзнача... ўзмацненьне антысавецкай ка... ніі ва ўсім капіталістычным ... це, і ў прыватнасьці ва Фра... адозва выступае на абарону ... Адозва адзначае, што эконом... барацьба Францыі супроць ССС... лілася ў форму так званай „... дэмпінгавай кампаніі“, тады ... аграрны крызіс ва Францыі ... якай меры не паглыбляецца ... портам савецкага хлеба. Кон... рацыя працоўных сялян Фр... заклікае працоўнае сялянства ... даць СССР.

Рабочая моладзь адма... ляецца ісьці ў армію

ЛЁНДАН. Ня гледзячы на ... ва і беспрацоўе, рабочая мола... Ангельшчыне ня хоча ісьці ў ... мію (у Ангельшчыне няма агу... воінскай павіннасьці). Анг... ўрад пашоў нават на тое, ... зьменшыў свае патрабаваньн... пункту погляду эгіпэцкага ... ваньня вярбуемых у армію, ... гэтая мера не дапамагла. ... урад рашыў узмацніць „кадры ... боўшчыкаў“. Салдатам даецца ... зачарговы водпуск 15 дзён ... кожнага маладога рабочага, ... баванага ў армію.

Сяляне прагналі салд...

ВЕНА, 5.—Як паведамляю... Бухарэсту, сяляне Бэсарабска... скі Новасуліца, Хоцімскага ... 30-га кастрычніка аказалі ў... нае супраціўленьне войскам, ... імкнуліся гвалтоўна рэквізава... няй для правядзеньня мане... Сяляне прагналі салдат і пра... валі іх на вялікай адлегласьці. ... моцненаму нараду жандармэрыі, ... прыбыў на дапамогу войскам, ... кі з цяжкасьцю ўдалося пр... сіць сялян да здачы. Прав... масавыя арышты. Прэса замоў... як лік арыштаў, так і лік ... нападу.

Масавыя прадвыбарч... я ... монстрацыі ў Вене

ВЕНА, 3.—Компартыя орг... вала ў Вене масавую прадвыбар... дэмонстрацыю. На чале дэмон... цыі стаялі члены чырвонай ра... абароны.

Адказны рэдакт...
Рэдколе...

ВЫХОДЗЬЦЕ НА УСЕБЕЛАРУСКІ УДАРНЫ СУБОТНІК

Плян правядзеньня суботніку па гор. Менску 8-га лістапада

1. Па ўсіх фабрыках, заводах і іншых гаспадарчых установах, рабочыя працуюць на сваіх прадпрыемствах. На тых прадпрыемствах, дзе маецца некалькі зьмен, працуе на сталай працы адна з зьмен, а ў гэты час рэшта рабочых працуе разам з абслугоўваючым апаратам прадпрыемстваў і студэнтамі тых факультэтаў, якія прымацаваны да тае ці іншае фабрыкі і заводу,—на падсобных работах у прадпрыемстве (мобілізацыя ўнутраных рэсурсаў, збор мэталялому, ачыстка заводзкіх двароў і г. д.).

2. Саюз савгандальслужачых, комунальнікаў, Нархарч (хатнія работніцы) вылучаюць па загаду камісіі адпаведную колькасьць брыгад для працы на чыгунцы, торфараспрацоўках, сельскіх гаспадарках і складах МЦРК, складах Саюзхлеба, на транспарце і іншых об'ектах працы, скарыстоўваючы рэшту сяброў саюзаў па сваіх установах і прадпрыемствах для усялякіх гаспадарчых работ, — збору мэталялому, утыль-сыравіны, макулатуры, дапушчаючы застаўленьне некаторых супрацоўнікаў гэтых устаноў на ўсякіх опэрацыйных работах па займаемай пасадзе.

3. Па загаду камісіі саюз швэйнікаў вылучае брыгады для папраўкі і шыцьця мяхоў у Саюзхлебе і МЦРК, якія павінны забясьпечыць вылучаныя брыгады месцам для правядзеньня гэтых работ, адпаведнымі прыладамі і матар'яламі.

4. Саюз мэдсанпрацы організуе брыгады па абгляду санітарнага становішча прадпрыемстваў, школ, складаў, пакгаўзаў, вакзалаў, сталовых, кр м, скарыстоўваючы рэшту сяброў саюзу па месцы іх працы на ўсялякіх гаспадарчых работах (збор мэталялому, утыль-сыравіны, макулатуры, шыцьцё і папраўка бялізны і г. д.).

5. Саюз працасьветы скарыстоўвае сяброў саюзу на гаспадарчых работах у навучальных установах, вылучае па школах адпаведны лік вучняў у загад Фрунзэўскага і Кастрычніцкаўскага РК ЛКСМБ для правядзеньня збору па горадзе мэталялому, утыльсыравіны і макулатуры.

6. Гарадзкі Белсампрамсаюзу праводзіць суботнік у сваіх арцелях, скарыстоўваючы рабочых на сталай працы і абслугоўваючы апарат—на ўсякіх падсобных работах: правядзеньне збору мэталялому, утыль-сыравіны, макулатуры і г. д.

7. Усе ЖАКТ'ы гораду праводзяць суботнікі па ЖАКТ'ах па збору мэталялому, утыль-сыравіны, макулатуры, ачысткі двароў, садоў і г.д.

8. Кіраўніцтва ўсёй працай суботнікаў на прадпрыемствах і установах ускладаецца на трыкутнік, які павінен да 6-га лістапада распрацаваць конкрэтны плян об'ектаў работ у сябе.

9. Усе сродкі ад правядзеньня суботнікаў павінны быць пераведзены гасп. органамі на працягу ня больш 5-ці дзён Дзяржбанку на бягучы рахунак у фонд агульнага навучаньня і політэхнізацыі школ.

10. Суботнік праводзіцца на працягу ня больш 4-х гадзін, з 9-ай гадзіны раніцы.

11. Усе прадпрыемствы, установы, ЖАКТ'ы, арцелі, якія ня змогуць у час суботніку здаць сабраны мэталялом, утыль-сыравіну, макулатуру,—павінны на працягу 3-х дзён перадаць іх у адпаведныя гаспадарчыя ўстановы.

12. Правядзеньне суботніку на чыгунцы ўскладаецца на т. Бабіч, Біге і Круга на торпараспрацоўках—т. Віктарава і Чахоўскага, у МЦРК — на т. Тарасэвіча і Жука, у Саюзхлебе—на т. Гершафта і Рыўкіна, на транспарце—на т. Кейліна і Аграната, на збору мэталялому і утыль-сыравіны па горадзе—на т. Рамізевіча (ЦК ЛКСМБ) і сэкратароў Фрунз. і Кастрычнік. РК ЛКСМБ па сваіх раёнах: па ЖАКТ'ах—на т. Бакуновіча, па Сампрамсаюзе — на т. Бацьвіньніка.

Цэнтральная камісія па правядзеньню суботніку ў горадзе Менску.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўліт бел № 50...